
...Урэшце Маё Беззаганнае Сэрца затрыумфуе
(з аб'яўленьняў Маці Божай у Фаціме)



Ave Maria

ВЫДАНЬНЕ ДАБРАЧЫННАГА ФОНДУ
«МАЦІ БОЖАЯ ФАЦІМСКАЯ»

№ 4 (6) 1995



Анёл жа, адказваючы жанчынам, сказаў: "Не бойцеся! Ведаю, што шукаеце Езуса ўкрыжаванага. Яго тут няма: Ён уваскрос, як і сказаў(...) Ідзіце, скажыце Яго вучням, што Ён уваскрос зь мёртвых"...

(Мц 28, 5-7)

Хрыстус зьмёртвыхпаўстаў! Алелюя!



ПАСТЫРСКАЕ ПАСЛАНЬНЕ НА ВЯЛІКДЗЕНЬ 1995 ГОДА

Бо Хрыстус быў ахвяраваны як наша Пасха. Таму сьвяткуйма наша сьвята не са старою закваскаю, з закваскаю зла і каварства, але з праснакамі чыстасьці і праўды.
(1 Кар 5, 7-8)

Вялікдзень – гэта трыумф Хрыстуса, Пана Зьмёртвыхпаўсталага, Які, склаўшы Сваё Цела і Сваю Кроў у Пасхальнай Ахвяры за людзкія грахі, перамог сьмерць і тым самым даказаў, што зьяўляецца Сынам Божым, Які завяршае справу Адкупленьня чалавечага роду. Таму ў Велікодныя сьвяты з радасьцю праслаўляем Божага Збавіцеля і дзякуем Яму за Яго Зьмёртвыхпаўстаньне, якое гарантуе нам права на жыцьцё вечнае.

Прымаючы ўдзел ва ўрачыстасьці Зьмёртвыхпаўстаньня Пана, кожны з нас павінен па-свойму глыбока перажыць Пасхальную містэрыю і не толькі ў сэнсе жыцьця вечнага, прадбачанага Богам, але яшчэ цяпер, у жыцьці часовым, праз цудоўнае адраджэньне нашых душаў, адкупленых Крывёю Хрыстуса і Зьмёртвыхпаўстаньнем Збавіцеля набліжаных да жыцьця ў нябеснай хвале.

Гэтае адраджэньне павінна ўвасабляць Зьмёртвыхпаўстаньне Езуса Хрыстуса ў нашых душах, а дакладней кажучы, павінна датычыць розуму, волі і сэрца.

1. (розум): Гэтаксама, як умярцьвёны Пан Езус быў пакладзены ў грабніцу, якая была прывалена каменем, апячатавана і ахоўвалася вартаю, так і наш розум не раз трапляе ў духовае ўмярцьвеньне – гэта значыць, у страту жывой веры праз абыякавасьць, сумненьні, прымхі, людзкія перакананьні і асьцярогі, уплывы антырэлігійнай прапаганды. Паўстаньне ж з гробу Хрыстуса Пана моцаю Яго Божага Сыноўства, якое зьнішчае аковы сьмерці і аднаўляе жыцьцё, павінна вызваліць наш розум ад праяваў бязьвер'я і ўмацаваць ў нашай душы цалкавітае адраджэньне веры ў Бога.

2. (воля): Гэтаксама і воля наша, якая павінна быць падуладная Божай ласцы, страчвае яе з-за граху, зьнявагі волі Божай, з-за выгодаў жыцьця, дагаджаньня пачуцьцям і падданьне нашэптам шатана, – і праз гэта вядзе душы да страты кантакту з Богам цяпер і ў вечнасьці. Сам Пан Езус жывучы на зямлі, часта быў сьведкам злой волі людзей і не адзін раз на Сабе зьведаў яе праявы, не адзін раз парушала яна права Божае. І толькі паўстаньне з гробу Хрыстуса Пана, якое пацьвердзіла Яго Боскасьць і якое дае гарантыю нашага зьмёртвыхпаўстаньня да жыцьця вечнага, выклікае ў нашай волі імпульс да ачышчэньня душы з грахоў і недахопаў, каб запанавала ў ёй ласка Божая, выслужаная мукаю і сьмерцю нашага Збавіцеля, – ласка, якая запэўнівае гэтай душы вечнае збавеньне.

3. (сэрца): І, нарэшце, – сэрца, якое не раз апаноўвае злосьць, нянавісьць, эгаізм, перастае быць належным жытлом любові Бога і бліжняга, і праз гэта штурхае душу на разрыў лучнасьці з Богам не толькі ў зямным жыцьці, але і ў жыцьці вечным. І от жа Пан Езус, выпрабаваны столькімі праявамі людзкое злосьці і нянавісьці, якая сягнула аж да ўкрыжаваньня Яго на Галгофе, даказаў Сваім Зьмёртвыхпаўстаньнем, што Яго Крывавая Ахвяра – знак звышчалавечае, Боскае любові, ажно да любові непрыяцеляў. Такім чынам, наш Збавіцель, перамагаючы сьмерць – вынік людзскога каварства, схіляе нас да вызваленьня нашых сэрцаў ад усялякіх праяваў злосьці і дае прыклад, каб у нашай душы заўсёды панавала любоў да Бога і бліжняга, якая гарантуе нам у жыцьці пасьля сьмерці права на вечную ўзнагароду ў небе.

Гэтыя разважаньні няхай нам дапамогуць правільна зразумець Пасхальную містэрыю. Вялікдзень – гэта не толькі традыцыйныя абрады, звычаі, як напрыклад – сьвянцонае, пісанкі, і нават сама рэзурэкцыйная працэсія вакол сьвятыні. Гэтыя Велікодныя сьвяты трэба перажыць глыбока ў душы, каб Зьмёртвыхпаўстаньне Хрыстуса Пана паўплывала на наш розум, на нашую волю, на нашыя сэрцы.

На розум – каб з абыякавасьці перайсьці да веры.

На волю – каб з граху перайсьці да Ласкі.

На сэрца – каб ад злосьці перайсьці да любові.

"Выкіньце ж старую закваску, каб сталіся новым цестам, бо вы – прэсныя", – гаворыць Сьвяты Павел у сваім пасланьні да карынцянаў (1 Кар 5,7).

Стараймася ж дамагчыся такіх перамен у часе гэтай Пасхальнай містэрыі, каб у нашай душы настала зьмёртвыхпаўстаньне, адраджэньне веры, ласкі і любові, каб сапраўды "вясёлы дзень для нас настаў". Гэта будзе задаткам нашага збаўеннага зьмёртвыхпаўстаньня для жыцьця вечнага.

Такія мае Велікодныя пажаданьні, да якіх далучаю пастырскае благаславеньне.

+ Kazimierz Card. Świątek

Кардынал Казімір Сьвёнтэк


Рэдакцыі і чытачам газеты "Ave Maria"



З нагоды майго першага сьвята Пасхі на Беларусі зь вялікаю радасьцю зьвяртаюся да ўсіх вас, каб перадаць мае найлепшыя пажаданьні шчасьця, міру, любові і згоды. Гэта дары першае сьветлае раніцы тыдня, Уваскрашэньня Пана нашага Езуса Хрыстуса, гэта плён Яго Ахвяры і Зьмёртвыхпаўстаньня.

Жадаю, каб вы жылі гэтымі дарамі, перадавалі іх вашым блізкім у сем'ях — маленькіх нашых храмах, у вашых парафіях, заўсёды адкрытых для сьвету, у кожным вашым дні, напоўненым любоўю. Няхай паспрыяюць яны еднасьці не толькі вернікаў, але і ўсяго люду Божага, каб заўтрашні дзень быў больш справядлівы, шчасьлівы і прасякнуты любоўю да бліжняга.

З Божым благаславеньнем



тытулярны арцыбіскуп Эсіхі,
нунцый Сталіцы Апостальскай
Аўгустыно Маркэтто

"СЛУХАЦЬ, РАЗУМЕЦЬ І ЛЮБІЦЬ..."

У першым нумары наша газета прадстаўляла чытачам Яго Эксцэленцыю нунцыя Сталіцы Апостальскай Аўгустыно Маркэтто, які 18 мая 1994г. быў накіраваны з дыпламатычнай місіяй на Беларусь. Даверыцельныя граматы прэзідэнту рэспублікі былі ўручаны 25 жніўня 1994г. Сёньня Яго Эксцэленцыя дае інтэрв'ю газеце "Ave Maria".

— Ваша Эксцэленцыя, вельмі многіх цікавіць, хто ж такі нунцый?

— Зь першых стагодзьдзяў жыцьця Хрысьціянскай Царквы ў Папы заўсёды былі свае прадстаўнікі. У самых аддаленых рэгіёнах Заходняга Патрыярхата іх называлі апостальскімі вікарыямі, а ў цэнтры — у імператараў і каралёў — такіх прадстаўнікоў называлі апакрызарыямі. І сёньня са згоды Каталіцкай Царквы і па волі Сьвятога Айца гэта традыцыя працягваецца: існуе афіцыйнае і пастаяннае прадстаўніцтва Сталіцы Апостальскай перад дзяржаўнай і царкоўнай уладамі. Цяпер гэтых прадстаўнікоў называюць нунцыямі, або пранунцыямі. Розьніца паміж назвамі чыста гістарычная.

— У чым заключаецца місія нунцыя перад царквою краіны, у якой ён зьяўляецца прадстаўніком Сталіцы Апостальскай?



— Другі Ватыканскі Сабор прадставіў Царкву як таямніцу супольнасьці і як бы вярнуў яе да вытокаў, да характэрных асаблівасьцяў жыцьця Царквы ў першым тысячагодзьдзі. Галоўная задача Папы як бачнай асновы гэтае супольнасьці, якою зьяўляецца Царква, — дапамагаць зьдзяйсьненьню адзінства ў веры, любові, сакрамантах і асноўных канонах Царквы. Гэту задачу ён выконвае таксама і праз сваіх прадстаўнікоў. Для ажыцьцяўленьня і ўмацаваньня гэтае супольнасьці нунцый прадстаўляе Папу, улічваючы асаблівасьці мясцовай царквы ў адзінстве ўсяе Царквы.

Пэўна ж, нунцый павінен азнаёміцца з мясцоваю царквою, імкнучыся пастаянна слухаць, разумець і любіць. Знаёмства з жыцьцём мясцовых цэркваў, (што датычыць майго асабістага вопыту ў Замбіі, Малавіі, на Кубе, Алжыры, Тунісе, Марока, Лівіі, Партугаліі, Зімбабвэ, Мазамбіку, на Мадагаскары і Танзаніі), — дазваляе нунцыю глыбей пазнаць і палюбіць Усяленскую Царкву ва ўсім яе харастве, шматграннасьці і адзінстве.

Гэты дар прадстаўнік Папы набывае на шляху свайго служэньня. Незалежна ад асаблівасьцяў культуры, мовы, клімату, ежы, ён знаходзіць ласку ўзрастаць у любові да Царквы Божай. Нунцый зьяўляецца своеасаблівым мастом паміж мясцовай царквой і Сталіцай Апостальскаю. Кажучы вобразна, ён — вока, вуха і рука Сьвятога Айца ў канкрэтнай краіне. Нунцый таксама не толькі язык Папы, словы якога ён павінен данесьці, але і яго сэрца. Праз нунцыя Сьвяты Прастол і Усяленская Царква праяўляюць сваю салідарнасьць з мясцоваю царквою. Асабліва гэта важна ў складаных сітуацыях: у выпадку ганеньняў, крызісу адзінства альбо веры, дыскрымінацыі. Ён павінен таксама спрыяць актывізацыі мясцовай царквы, паважаючы місію і службу біскупа, — пераемніка апосталаў і пастыраў гэтай царквы. Безумоўна, Папа, як пастыр Усяленскай Царквы, нясе адказнасьць за гэту мясцовую царкву. Прадстаўляць Папу ў мясцовай царкве ў пастырскім кантэксьце зьяўляецца самым важным асьпектам задачы нунцыя, асабліва пасьля II Ватыканскага Сабора, які садзейнічаў пастырскаму абнаўленьню.

II Ватыканскі Сабор падкрэсьліў, што экуменізм — г.зн., пошук адзінства хрысьціян, зьяўляецца састаўною часткаю Царквы. Таму прадстаўнік Папы ў сваёй дзейнасьці павінен клапаціцца пра кантакт і дыялог з братамі і сёстрамі іншых цэркваў, асабліва зь іх біскупамі і пастырамі.

II Ватыканскі Сабор даў пачатак дыялогу і зь нехрысьціянскімі рэлігіямі. Таму, па магчымасьці, нунцый павінен наладжваць кантакты з іудзеямі і мусульманамі. І, як вядома, Царква, а значыць, і апостальскі нунцый імкнуцца весьці дыялог нават з атэістамі.

— Якая Ваша роля ў адносінах да дзяржавы?

— У адносінах да дзяржавы нунцый праяўляе тыя ўвагу і клопат, якія адлюстроўваюць адносіны Сьвятога Айца да гэтай краіны. Улічваючы адзьдзяленьне Царквы ад дзяржавы і іх розныя мэты, нунцый імкнецца знайсьці агульныя кропкі судакрананьня для найбольш поўнага пасьпяховага супрацоўніцтва, каб тым самым паслужыць на карысьць грамадства. Гэта вельмі важна, бо у адной і той жа краіне людзі могуць належаць да Царквы і да дзяржавы. Таму нунцый сваёю місіяй павінен спрыяць дыялогу паміж імі для больш поўнага ўзаемаразуменьня і пасьпяховага супрацоўніцтва. Прытым, неабходна ўлічваць рэальныя асаблівасьці мясцовай царквы. Глыбока рэлігійная місія нунцыя адкрыта да шчырага супрацоўніцтва зь дзяржаваю для міру і дабра. Не ва ўсіх людзей аднолькавыя ўяўленьні пра сьвет. У Сьвятога Прастола, безумоўна, сваё бачаньне сьвету. У энцыкліцы Папы Яна XXIII "Pacem in terris" ("Мір на зямлі") мне імпануе думка, што асноваю сьвету зьяўляюцца ісьціна, справядлівасьць, любоў да бліжняга і свабода - і можна да гэтага дадаць: гарманічнае разьвіцьцё чалавека ў сукупнасьці духоўнага і матэрыяльнага. Папа Ян Павел II бачыць у недастатковым разьвіцьці чалавека пагрозу для сьвету. Трэба падкрэсьліць, што сёньня Сьвяты Прастол асаблівую ўвагу надае правам ча-

лавека. І, калі больш канкрэтна, — свабодзе сумленьня, свабодзе рэлігій і свабодзе культа. Гэта не выпадкова, паколькі зьяўляецца самой сутнасьцю Сьвятога Прастола.

— Якія адносіны паміж нунцыем і біскупамі краіны, у якой ён працуе?

— Як вядома, II Ватыканскі Сабор падкрэсьліваў неабходную сувязь паміж першынством Папы, якога прадстаўляе нунцый, і саборнасьцю біскупаў. Такім чынам, паміж біскупамі і нунцыем неабходна не толькі пастаяннае супрацоўніцтва, але і ўзаемапавага, клопат і згода. Недастаткова сустрэцца з біскупамі толькі тады, калі трэба вырашыць нейкую праблему альбо аб чымсьці яго праінфармаваць, — кантакт паміж нунцыем і біскупамі павінен быць пастаянным.

— Ці падпарадкоўваецца біскуп нунцыю?

— Не. Існуе, як ужо адзначалася, пастаянны кантакт, скаардынаваныя адносіны на розных узроўнях. Па асноўных палажэньнях Царкоўнага Права, паколькі нунцый прадстаўляе Пятра і яго функцыі, біскупы, натуральна, павінны быць у згодзе. Аднак гэта не азначае, што нунцый зьяўляецца біскупам дыяцэзіі, альбо што ён можа замяніць біскупа мясцовай царквы. Таму што нават прадстаўнік Папы павінен паважаць правы мясцовага біскупа, як пераемніка апосталаў.

У сувязі з гэтым хачу зазначыць, што самаю цяжкаю задачаю нунцыя па існучых законах Каталіцкай Царквы зьяўляецца яго адказнасьць у выпадку прызначэньня біскупа. Гэта павінна адбывацца з улікам і разуменьнем існуючай рэальнасьці, а таксама пры ўважлівым вывучэньні сітуацыі і кандыдатур. У гэтым пытаньні павінна праявіцца мудрасьць Царквы. Вынік такога аналізу — даклад нунцыя Апостальскай Сталіцы. Канчатковае ж рашэньне па гэтым пытаньні прымае Папа.

— Многіх цікавіць, што сабой уяўляе працоўны дзень нунцыя?

— Працоўны дзень нунцыя падобны на працоўны дзень кожнага біскупа: малітва, літургія, удзяленьне сакрамантаў, дзелавыя сустрэчы, чытаньне прэсы і духоўнай літаратуры, візіты. Гэта штодзённае жыцьцё напоўнена духоўнасьцю, як і жыцьцё кожнага біскупа — прадстаўніка Езуса Хрыстуса. Паколькі нунцый зьяўляецца прадстаўніком таксама біскупа Рыма, г.зн. Папы, ён павінен імкнуцца выказваць не сваю думку, а перш за ўсё быць рэхам Евангельля і вучэньня Папы. Павінен прадстаўляць сьветапогляд Папы і яго пастырскі прыярытэт, яго абарону правоў чалавека, праяўляць яго пастырскі клопат. У выніку нунцый — не толькі чыноўнік, нават калі ён шмат часу праводзіць у офісе. Уся яго дзейнасьць прасякнута пастырскім духам, які дазваляе яму за дакументамі і паперамі бачыць канкрэтных людзей — хрысьціян, веруючых; краіну, зь яе лёсам і гісторыяй, зь яе праблемамі, якія трэба дапамагчы вырашыць, і зь яе добрымі памкненьнямі, якія трэба пазнаць і дапамагчы іх разьвіць.

— Што б Вы хацелі пажадаць Царкве на Беларусі?

— Як я ўжо гаварыў на інгрэсе Яго Эмінэнцыі кардынала Казіміра Сьвёнтка ў чатырох катэдрах (Мінскай, Магілёўскай, Гродзенскай, Пінскай), вялікая задача, якая стаіць перад намі, — ажыцьцяўленьне пастановаў II Ватыканскага Сабора. І гэта менавіта тая праграма, якую Папа Ян Павел II прадставіў Усяленскай Царкве з нагоды юбілею 2000 года і пачатку трэцяга тысячагодзьдзя. Хачу нагадаць тры асноўныя задачы, якія вынікаюць з пастановаў II Ватыканскага Сабора:

- трэба прыкласьці ўсе намаганьні, каб Царква сапраўды стала мясцоваю, г.зн., была ўвасоблена ў канкрэтным месцы, культуры, гісторыі і г.д.;
- неабходна таксама прымаць да ўвагі канстытуцыйнае вымярэньне Царквы, якім зьяўляецца экуменізм, імкненьне да адзінства хрысьціян;
- у адносінах "Царква-сьвет" і сьвецкія асобы павінны разумець сваю задачу пабудовы новага (у сэнсе евангельскім) грамадства на Беларусі — грамадства больш справядлівага, чалавечнага, салідарнага і свабоднага, з поўным захаваньнем правоў чалавека.



ВЕЛІКОДНЫ ТРЫДЫУМ

"Самаю вялікаю падзеяй у гісторыі сьвету зьяўляецца Хрыстова Зьмёртвыхпаўстаньне".
Л.Борас

Ушанаваньне Сьмерці і Зьмёртвыхпаўстаньня Пана Езуса доўжыцца поўныя тры дні. Распачынаецца яно ў Вялікі Чацьвер вечарам, а заканчваецца вечарам у нядзелю. Вялікодны Трыдыум зьяўляецца своеасабліваю кульмінацыяй усяго касьцельнага году. Гэта не падрыхтоўка да Вялікадня, але ўжо само ўшанаваньне Хрыстовай Пасхі, праз удзел у Яго Муцы, Сьмерці і Зьмёртвыхпаўстаньні. Вернікі павінны прымаць самы шчыры ўдзел у гэтых абрадах, прымаць Сьвятую Камунію, таму споведзь павінны адбыць да Вялікага Чацьвярга. Каб па-сапраўднаму зразумець Велікодны Трыдыум, трэба памятаць, што Сьмерць і Зьмёртвыхпаўстаньне Хрыстуса — адно цэлае. Хрыстус адкупіў чалавецтва не толькі праз Сваю Сьмерць, але і праз Зьмёртвыхпаўстаньне, — значыць, усёю Пасхальнаю містэрыяй.

Апошняя Вячэра ў Вялікі Чацьвер




Вечарам у Вялікі Чацьвер зьбіраюцца ўсе вернікі разам са сваімі душпастырамі, каб ушанаваць Апошнюю Вячэру ў часе ўрачыстай Сьвятое Імшы. Евангельле гэтай Імшы гаворыць пра ўмываньне ног апосталам. (Яна 13,1-15) Узаемная любоў павінна быць умоваю і плёнам Эўхарыстыі. Насьледуючы Хрыста, сьвятар можа, паводле Евангельля, абмыць ногі дванаццаці мужчынам. На Gloria звоняць званы, а пасьля змаўкаюць аж да Пасхальнай Вігіліі.

Пасьля Сьвятой Імшы ва ўрачыстай працэсіі пераносіцца Найсьвяцейшы Сакрамант да цямніцы (бочная капліца), дзе вернікі адаруюць Пана Езуса да поўначы, разважаючы Яго пакуту ў Садзе Аліўным. З алтара здымаюць ўбраньне як сімвал таго, што зь Езуса зьдзерлі шаты.

У Вялікі Чацьвер таксама ўспамінаецца ўстанаўленьне Сакраманту сьвятарства. Таму раніцаю ў катэдрах біскуп адпраўляе ўрачыстую Сьвятую Імшу, канцэлебраваную з сьвятарамі сваёй дыяцэзіі. У часе Сьвятой Імшы асьвячаецца алей і крыжма, а сьвятары складаюць сьвятарскую прысягу.

Вялікая Пятніца



У Вялікую Пятніцу не адпраўляецца Сьвятая Імша. Па палудні вернікі зьбіраюцца на набажэнства, каб ушанаваць Муку Хрыстуса. Самае важнае ў часе гэтага набажэнства – ушанаваньне таямніцы Крыжа.

Набажэнства распачынаецца пры алтары, на якім няма крыжа, сьвечак і абрусаў. Уся літургія скіравана на тое, каб засяродзіць увагу вернікаў на алтары, які сімвалізуе Самога Хрыстуса.

Набажэнства ў Вялікую Пятніцу складаецца з наступных частак:

- *Літургія Слова*: сьвятар з міністрантамі ва ўбраньні чырвонага колеру ў цішы падходзіць да алтара, чытае малітву, потым адпраўляецца *Літургія Слова*. Яна складаецца з двух чытаньняў – апісаньне Мукі Хрыстуса паводле Сьв.Яна (Ян 18,1-19,42), казаньне і ўрачыстая малітва верных (за ўсё чалавецтва, за Касьцёл, пастыраў і вернікаў).

- *Адарацыя Крыжа*: унясеньне Крыжа,

акрытага жалобнаю фіялетаваю тканінаю. Потым тканіна паступова адсланяецца з Крыжа, і ў гэты час сьвятар тройчы сьпявае: "Вось дрэва Крыжа, на якім завісла Збавеньне сьвету". Вернікі адказваюць: "Пойдзем з паклонам". Распачынаецца адарацыя Крыжа – люд Божы падыходзіць да Крыжа, цалуе гэта збаўеннае дрэва з удзячнасьці за адкупленьне.

- *Сьвятая Камунія*: жыцьцядайным плёнам сьмерці Хрыстуса зьяўляецца Эўхарыстыя, таму вернікам удзяляецца Сьвятая Камунія, кансэкраваная ў Вялікі Чацьвер. Праз гэта Касьцёл падкрэсьлівае еднасьць Ахвяры Вячэрніка з Ахвяраю Крыжа.

- *Працэсія да гробу Панскага*: пасьля абрадаў Вялікай Пятніцы Найсьвяцейшы Сакрамант пераносяць ў манстранцыі да так званага гробу Божага. Вернікі там адаруюць Найсьвяцейшы Сакрамант да Зьмёртвыхпаўстаньня.

Вялікая субота

У Вялікую Суботу ў касьцёлах не адпраўляецца Сьвятая Імша. Вернікі зьбіраюцца пры гробе Пана Езуса, каб разважаць Яго Муку і Сьмерць. Гэта дзень цішы і засяроджанасьці. У Вялікую Суботу асьвячаюцца вялікодныя стравы.

Вялікдзень – Нядзеля Зьмёртвыхпаўстаньня

Ноч, перад Нядзеляю Зьмёртвыхпаўстаньня (Вялікая Ноч) для хрысьціян была ночаю чуваньня. Яе праводзілі ў малітве і слуханьні Слова Божага.


Хрысьціяне перанялі практыку чуваньня і чаканьня ў гэту ноч на вяртаньне Зьмёртвыхпаўсталага Хрыстуса. У касьцёлах адбываецца Літургія Пасхальнай Вігіліі, якая складаецца з наступных частак:

- *Літургія Сьвятла*: Перад касьцёлам сьвятар сьвеньціць агонь, потым запальвае пасхал (вялікую сьвечку, якая сімвалізуе ўваскрослага Хрыстуса). З працэсіяй пасхал ўносяць у касьцёл, дзе згашана сьвятло. Сьвятар тройчы сьпявае "Сьвятло Хрыстуса", а вернікі з удзячнасьцю адказваюць "Дзякуем Пану Богу" і запальваюць ад пасхала свае сьвечкі. Потым сьвятар ці дыякан сьпявае пасхальнае пасланьне "Exsultet", старажытны хрысьціянскі гімн хвалы (VIIст.). Гэты гімн услаўляе Уваскрослага Хрыстуса, Якога сімвалізуе запаленае сьвятло.




- *Літургія Слова* складаецца з дзевяці чытаньняў Сьвятога Пісаньня: сем са Старога Запавету і два з Новага Запавету (epistola і Евангельле). Перад чытаньнем з Новага Запавету (epistola) сьвятар пачынае сьпяваць гімн Gloria і пачынаюць званіць званы. Перад Евангельлем зноў сьпяваецца пасьля саракадзённага перапынку радаснае Alleluja.

- *Літургія хрысьцільная*: пасьля Літаніі да Ўсіх Сьвятых сьвятар асьвячае хрысьцільную ваду і пасьля ўдзяляе Сакрамант Сьвятога Хросту. Калі няма нікога да Сьвятога Хросту і не асьвячаецца хрысьцільная вада, то сьвятар благаславіць ваду для акрапленьня. І затым адбываецца аднаўленьне прысягаў Сакраманту Хросту і акрапленьне вернікаў вадою - гэта напамінак пра наша хрышчэньне і пра нашу вернасьць Хрысту.



- *Літургія Эўхарыстычная* – пасьля начнога чуваньня Зьмёртвыхпаўсталы Езус запрашае нас на пасілак, які прыгатаваў праз Сваю Сьмерць і Ўваскрашэньне. Эўхарыстычная Літургія распачынаецца прыгатаваньнем дароў. Тэксты і сьпевы – вялікодныя. Гэта першая Вялікодная Сьвятая Імша, нават калі яна і скончыцца перад поўначчу Вялікай Суботы.

- *Працэсія Рэзурэкцыйная:* адразу пасьля вігілійнай Імшы, альбо раньнім ранкам адбываецца ўрачыстая рэзурэкцыйная працэсія, у часе якой нясуць Найсьвяцейшы Сакрамант і сімвал зьмёртвыхпаўстаньня (фігурку Хрыстуса, крыж, перавязаны чырвонаю стулаю). Працэсія пачынаецца ад гробу Панскага і абыходзіць адзін альбо тры разы касьцёл пад радасны вялікодны сьпеў.



"...Няхай сапраўды жыцьцё вашае стане ўваскрослым жыцьцём з Хрыстусам, жыцьцём шчырых сьведкаў узьнёслай праўды зьмёртвыхпаўстаньня перад усім сьветам".

Ян Павел II



СПАДЧЫНА

У гэтым сьвяточным нумары мы публікуем фрагмент вялікоднага ліста нашага знакамітага земляка Ігната Дамейкі, які ён напісаў паўстагодзьдзя назад з далёкае Чылі да сваіх родных у Парыж. Калі чытаеш ліст, міжволі думаеш, як важна для нас, сёньняшніх каталікоў, адчуць праз акіяны і стагодзьдзі еднасьць у веры з тымі, што жылі задоўга да нас. Як важна нам, сёньняшнім, яшчэ раз упэўніцца, што калісьці даўным-даўно, невядома за якімі гарамі й марамі, людзі, аказваецца, перажывалі амаль тыя ж пачуцьці жальбы і смутку ў часе Вялікага тыдня і з такім жа ўрачыстым душэўным узрушэньнем чакалі Зьмёртвыхпаўстаньня. Як жа саграе сэрца такое жывое ўсьведамленьне непарыўнае еднасьці, моцы і велічы нашае веры. І таму яшчэ раз з удзячнасьцю згадайма сёньня таго, хто падаравай нам праз свой ліст мажлівасьць перажыць высокія і сьветлыя пачуцьці, згадайма вялікага сына Беларусі Ігната Дамейку, сусьветна вядомага вучонага, блізкага сябра Адама Міцкевіча, якому было наканавана аддаць свае сілы і талент далёкай Лацінаамерыканскай краіне і стаць яе нацыянальным героем, а нам у спадчыну пакінуць свае непаўторныя літаратурныя творы, свае лісты і сваю гарачую, сыноўнюю любоў да Айчыны.

Сант'яга, Вялікдзень, 4 сакавіка 1847 года.

Мае любыя Уладыслаў і Валеры.

Сёньня пасьля набажэнства я адчуў невыказнае жаданьне напісаць да вас: вырашыў на валачобнае даць вам кароткае апісаньне Вялікага Тыдня ў гэтай сталіцы.

У Вялікі Чацьвер, як толькі зазвоняць на Gloria, ва ўсім горадзе наступае поўны спакой і ціша; нельга нікому ані самаходам ані конна ехаць па вуліцы і ніякага транспарту не пускаюць у горад. Гэта ўносіць асаблівую зьмену ў сталіцу, у якой праз увесь год стаіць амаль такі самы шум і мітусьня, як у вашым Парыжы; здаецца, як быццам на ўспамін Хрыстовай сьмерці спынілася ў людзях жыцьцё ад смутку. Такая ціша стаіць ажно да вечара, а як толькі пачынае шарэць, амаль увесь люд, да 6000 жыхароў, выходзіць на вуліцы і ідзе наведваць магілы, таксама, як і ў нас. Тут праяўляецца даўняя іспанская павага і набожнасьць: жанчыны, акрытыя чорнымі шалямі (basguina), багацейшыя -- атласнымі, бяднейшыя -- ільнянымі, усе адзетыя ў чорнае, як у найвялікшую ўрачыстасьць. Просты люд у сваіх нацыянальных плашчах, якія называюцца пончо. Усе падзяляюцца на групы, мінаюцца, не зважаючы адны на другіх, не вітаюцца, не размаўляюць паміж сабою; усе з суровымі тварамі, з апушчанымі вачыма, мужчыны з непакрытымі галовамі, дамы з апушчанымі вуалямі, а разам зь імі -- маленькія дзеці, якія ледзьве ўмеюць хадзіць. Месцамі відаць групы адных толькі старых і немаўлят. Пажылыя матроны гавораць ружанец з сваімі праўнукамі. Сярод гэтага тлуму, што поўніць вуліцы глухім суцэльным малітоўным шэптам, лёгка заўважыш індыйскія аблічча, твары неграў, метысаў і людзей самых розных нацыянальнасьцей. Сьнежныя пікі Кардыльераў, якія строма ўздымаюцца над горадам, месяц у поўні, тысячы сьвечак па касьцёлах і сухі шэлест пальмаў у кляштарах надаюць гэтай карціне незвычайнае хараство і мясцовы каларыт. Як жа міла душы бачыць тут людзей, якія ўголас моляцца на вуліцы, не зважаючы на сьвет і яго ўмоўнасьці. Відаць тут яшчэ даўніх пакаяльнікаў, якія як бы не пасьпеўшы за імклівым часам, прыпыніліся на дарозе, забыўшы зьмяніць уборы і звычаі. Уявіце сабе гладкі, чорны, высокі, востра загнуты каўпак, у якім хаваецца ўся галава і твар пакаяльніка аж да шыі! Два малыя разрэзы для вачэй, чарнейшыя за сам каўпак вочы, і трэцяя прадаўгаватая шчыліна на вусны і на ноздры; чорная сукня, як сшытая з аднае штукі, што спадае ад шыі ажно да зямлі, і на ёй -- белая мужчынская палатняная ліштва накшталт стулы, прышпіленая на грудзях. Такое ўбраньне гэтых людзей, празваных як бы з мэтаю прыніжэньня kukuruczos, якія тут і там снуюць сярод пабожнага люду, альбо стаяць на варце каля магілаў, альбо затрымліваюцца каля касьцельных дзьвярэй збоку нявольнікаў з публічнае турмы, якія тут жабруюць, трасучы цяжкімі ланцугамі і сваім енкам памнажаючы смутак і

жалобу ўрачыстасьці. Дадайце ж да гэтага касьцёльныя хоры, сьпевы манахаў і манашак па ўсіх кляштарах, чыстае неба, спакой у паветры і ўмеркаванае цяпло начы, і зразумееце, што я ў гэты вечар павінен быў адчуваць і думаць, праціскаючыся праз натоўп набожнага люду...

У Вялікую Пятніцу тут такія самыя абрады, як і ў нас. Уявіце сабе такія ж сьпевы, такія ж алтары і арнаменты; касьцёлы такой жа формы і такую ж самую мову, што і ў нас (бо іспанцы амаль таксама вымаўляюць па лаціне, як і мы), і зразумееце, чаму так часта я іду да касьцёла, іду, як у Польшчы, і ў касьцёле аддаю сябе ва ўладу мілым чароўным ілюзіям, як бы знаходжуся ў Чэнстахове ці ў Жыровічах. (...)

На вялікім рынку перад касьцёлам францішканаў збудавана і намалявана на некалькі дзесяткаў ступеняў уверх высокая гара, на якой пастаўлены тры крыжы. Да аднаго прыбіта фігура Езуса, да двух другіх -- статуі разбойнікаў, на доле, пад голым небам установлены амвон, каля якога сабралася амаль трыццаць тысяч людзей. Калі сшарэла, на амвон узышоў агромністай сілы казнадзея, іспанец, які меў гадзіннае казаньне, а гаварыў так зычна, магутным голасам, з такім запалам і агнём, што ўся грамадскасьць была як зачараваная. Ох, калі б вы ведалі, што гэта такое -- іспанская мова, якою гавораць пра Бога пад зорным небам! Якая павага, веліч, годнасьць і музыка. Ціша панавала такая, як быццам жывой душы не было вакол, хоць ані паліцыі, ані жандармаў, ані швейцараў не было бачна. У казаньні гаварылася пра Муку Хрыстову, і калі дайшло да моманту, калі пасьля сканаsuccessьня Езуса, Юзаф з Арыматэі прасіў цела Збавіцеля, каб Яго пахаваць, узышлі на Кальварыю людзі з паходнямі і трое манахаў у альбах з драбінамі, молатам і абцугамі. Казнадзея працягваў далей і апавядаў, як навучае Пісаньне, а манахі ў той жа час прыставілі да крыжа драбіны, паступіліся на іх і пачалі выбіваць цьвікі. На стук малаткоў і на змрочны, пранікліва-моцны голас неспрацаванага казнадзея, плач агарнуў кабет, і ў гэты момант выйшаў з-за Кардыльераў месяц. (...)

Найперш быў выняты цьвік з левай рукі і паволі апушчана левае пляччо Езуса, потым тое ж было зроблена з правым плячом, а ў канцы гэтак жа нясьпешна вынялі цьвікі з ног і апусьцілі фігуру Езуса, якая была так па-майстэрску, дасканала зроблена, што ногі і рукі згіналіся так, быццам былі цялесныя.

Тым часам казнадзея скончыў казаньне. Люд біў сябе ў грудзі, перапрашаючы Пана Бога за грахі. Загорнутую ў белую мусьлінавую прасьціну фігуру Хрыстуса паклалі на агромністы воз, зроблены накшталт гробу, аточанага аблокамі і залатымі прамянямі. У гэты час вырушыла працэсія. Наперадзе ішла вялікая фігура прарока Ісаі, які прадвяшчаў сьвету новую эпоху, а за ёю некалькі соцен дзяцей з пальмамі, далей -- крыж Збавіцеля на вялізным пастаменьце, на якім стаялі дзьве прыгожыя, па-анельску ўбраныя дзяўчыны, якія атулялі сваімі рукамі сьвятое дрэва; яшчэ далей, за пару соцен крокаў, нясьлі на залатых тацах цьвікі і кароны, і на асобным пастаменьце групу фігур, якія прадстаўлялі Муку Хрыстовую. Уявіце сабе, якой велічыні павінен быць той пастамент з фігурамі, калі паміж імі зьмясьціўся жаўнер на кані, амаль натуральнай велічыні, з дзідаю ў руцэ. Ён вастрыём гэтай сваёй доўгай дзіды не даставаў крыху да боку Езуса на вялізным крыжы. Шэсьцьдзесят чалавек несла гэты агромністы твор Мукі Пана, а праз пару соцен крокаў за ім несьлі не меньш цяжкі гроб Збавіцеля, пра які я ўжо згадваў, і за ім на асобным, такім жа вялізным пастаменьце фігуру Найсьвяцейшай Панны Балеснай натуральнай велічыні, акрытую чорным хітонам. Каля яе ног бавіліся дзевяцёра дзяцей, убраных за анёлаў. І ўсе гэтыя карціны, фігуры, пастаменты былі аздобленыя мільёнамі кветак і ярка асьвечаныя зялёнымі і пунсовымі сьвечкамі. Немагчыма зьлічыць шматлікіх харугваў і абразоў, якія нясьлі на той жа працэсіі; тысячы людзей са сьвечкамі, шматлікія законы, муніцыпальная рада, эскадрон коннай гвардыі, батальён пяхоты і амаль увесь горад суправаджаў гэту працэсію. Дзьвесьце kukuruczos, альбо гэтых чорных пакаяльнікаў пільнавалі парадку; за кожным абразом ішоў пакаяльнік з трубою, на якой час ад часу трубіў такім сумным і пранізьлівым голасам, як быццам голас гэты быў сігналам на сканчэньне сьвету.

У апошні дзень, у суботу, усе цырымоніі заканчваюцца касьцёльнаю Імшою, на якой упершыню звоняць званы на Gloria; і тут жа тысячы вазоў і коней з усіх бакоў урываюцца ў горад; наступае галас і мітусьня, як на нашых кірмашах; страляюць з гарматаў і звоняць ва ўсе званы. (...)

Вечарам у гэты дзень няма ў касьцёле набажэнства. Тут не ведаюць ані нашых рэзурэкцый, ані фарбаваных яек, ані сьвянцонага...

Пераклад з польскай К.



Марыя КАНАПНІЦКАЯ

У ВЯЛІКУЮ ПЯТНІЦУ

Так мне часам здаецца, о Хрыстэ,
Што не там дзесьці далёка за морам,
Але тут, у нас, меў шлях Ты цярністы
І што нашым праходзіў Ты полем,
Пускаючы пальцы па арфе каласоў,
Што, як людзі ўздыхаюць і маюць рэха галасоў.

І што тут, у якойсьці з хат нашых, о Пане,
Дзе жабракамі паабіваны парогі,
Быў Твой смутны вячэрнік і расстаньне,
І хлеб з братамі ламаны, і трывога,
Каб слоў апошніх не выдалі сьцены.
І разьвітаньня келіх – Крывёю Тваёю пеніў.

І здаецца мне, што нашыя сосны,
Бярозы шумлівыя сярод нівы –
То быў Агруец Мукі Тваёй жалосны,
То былі месячныя Твае алівы.
І што ў тую ноч пот Твой капаў крывавы
На зёлкі лясныя нашы і на травы.

І здаецца мне, што тут Ты быў спайманы,
У путы закуты і каля слупа бічаваны,
Бо так вядомы, о Хрыстэ, мне гэтыя раны,
І моц Твая, і катаў Тваіх гайня,
І сьвіст рамянёў, якія крояць нажамі,
Што не магло гэта быць дзесьці там, за гарамі.

Знаю, што тут, на мяжы, бліз дарогі,
Пры якойсьці старой, запалай магіле
Павінен быў вырасьці зарасьнік цёрну і глогу,
Калючкі якога ў галаву прасьвятую Тваю ўпіліся.
Бо ніякія ў сьвеце так раніць не могуць,
Як тыя, што растуць каля нашай дарогі.

І здаецца, што тут Ты ляжыш у цямніцы,
Каменем цяжкім гроб Твой закрыты,
І пільнай ахове Тваёй не сьпіцца.
Але я з хваляваньнем чакаю нязбытным,
Бо ведаю й чую, што тут менавіта, о Пане,
На трэці дзень Ты зьмёртвыхпаўстанеш.

Пераклад з польскай К.

Мар'ян ДУКСА

ХАДЗІЦЬ ДА АЛТАРА

Хадзіць да алтара,
Калі зазьзяе раньне
І смагай веры стане
Сьвітальная пара.

Хадзіць яшчэ тады,
Як радаснае сэрца
Крыніцай гулкай б'ецца,
Не знаючы жуды.

Хадзіць да алтара,
Як пройдзе час хлапечы,
І зваліцца на плечы
Зямных турбот гара.

Ад клопатаў усіх
Заныюць ногі-рукі.
І запануюць мукі
Ў душы на нейкі міг.

Хадзіць да алтара,
Як згаснуць сонца чары
І заццвіце на твары
Вячэрняя зара.

Жыцьця вялікі цуд
Адбудзецца займальна...
І стане разьвітальным
Штодзённы твой маршрут.

Найлепшая пара –
Адчуць з абдымкаў змогі,
Што ўсе твае дарогі
Вядуць да алтара.

Сяргей НОВІК-ПЯЮН

НА ВЯЛІКДЗЕНЬ

Голасам магутным загрымелі звоны. –
Па блакітным небе ў блеску сонца кос
Паліліс ўрачыста радасныя тоны
Бо Хрыстос памёршы ў трэці дзень ўваскрос.

Вецярок вясьняны з радасьці сьпявае,
Птушак пералівы ймкнуцца ў вышыню,
А вясна на ліры гімн Хрысту іграе,
Гожа прыбірае краскамі зямлю.

І ты, людзкі родзе, ранамі Хрыстуса
Збаўлены ад грэху, зрок ўзьнясі ўвысь!
Удзячнаю малітвай добраму Ісусу,
Сэрцам і душою, горача маліс!

Голасам магутным грымяць сёньня звоны,
Па блакітным небе, ў блеску сонца кос,
Льюцца ўрачыста радасныя тоны,
Бо Хрыстос, наш Збаўца, ў трэці дзень ўваскрос!

Сяргей Новік-Пяюн

ЖЫВУЦЬ БЕЛАРУСКІЯ ПІСАНКІ

Памятаю з дзяцінства, што Вялікодныя сьвяты наша сям'я заўсёды адзначала ў бабулі на вёсцы. А там, як і ўсе вясковыя дзеці, разам з стрыечнымі братамі, мы з сястрой хадзілі ў жакі (валачобнікі). Было ў нас своеасаблівае спаборніцтва -- хто болей назьбірае найпрыгажэйшых яек. Пафарбаваныя шалупіньнем цыбулі, яйкі лічыліся звычайнымі, і ні ў кога не выклікалі асаблівай цікавасьці. Затое колькі было радасьці, калі ў кошычку зьяўлялася рознакаляровае, часам нават з малюнкам, яйка -- пісанка.

Відаць, з таго часу засталая ў мяне цікавасьць да размаляваных яек. На Вялікдзень, калі асьвячаецца ў касьцёле сьвяточная ежа, міжволі зьвяртаеш увагу на кошыкі парафіян і не-не ды й убачыш цудоўную пісаначку.

Даводзілася неаднойчы бачыць вялікодныя яйкі-размалёўкі ў Расіі, на Украіне. Аднак самыя прыгожыя ўсё ж на Беларусі. У гэтым я канчаткова ўпэўнілася, калі пазнаёмілася з Галінай Пятроўнай Дамашэвіч з роду Пілецкіх. Гэта жанчына малюе пісанкі на паперы. Сёньня яна мае ўжо 500 альбомаў і ў кожным зь іх па 500 яек -- малюнкаў. Той, хто бачыў гэту цудоўную калекцыю адзначае, што яна вартая кнігі рэкордаў Гінэса.

Сталае захапленьне маляванкамі, іх калекцыянíраваньне прыйшло да Галіны Пятроўны каля 20 гадоў таму. Перад Вялікаднем захацела павіншаваць сваіх родных і сяброў з самым сьветлым для ўсіх хрысьціян сьвятам. Але вялікодных паштовак тады не было. Выйсьце падказаў бацька-нябожчык, які ў сьне нагадаў, што яна можа сама намаляваць, бо калісь яны разам гэта рабілі. Галіна Пятроўна паспрабавала, паслала свае паштоўкі-самаробкі ў Польшчу, Амерыку, Англію. Неўзабаве прыйшлі адтуль шчырыя словы падзякі і захапленьня.



Жаданьне працягваць гэтую справу падтрымаў сябра сям'і, пісьменьнік Уладзімір Караткевіч. Неяк на Вялікдзень Галіна Пятроўна падаравала яму некалькі пісанак, вядома ж, не папяровых, а сапраўдных. Яны так уразілі пісьменьніка, што ён колькі дзён запар угаворваў яе сур'ёзна заняцца маляваньнем. Угаворы тыя згадала праз колькі часу, калі на душы было асабліва сумна і цяжка. Раней ў такія хвіліны звычайна вязала альбо шыла. Цяпер жа ўзяла паперу, пэндзлік, ды рука, быццам драўляная, не хацела слухаць. Але перамагла сябе, не адкінула занятку. Паступова пальцы рабіліся мягчэйшыя, пачыналі слухацца. Перад вачыма заіграла яркая вясёлка будучай пісанкі, а праз гадзіну і само яйка-маляванка было гатова. Вось так пачалася ўнікальная калекцыя беларускіх пісанак Галіны Пятроўны Дамашэвіч.

Нельга сказаць, што гэта справа для яе была новая і невядомая. Галіна Пятроўна вырасла ў інтэлігентнай каталіцкай сям'і. Бацькі працавалі настаўнікамі на Палесьсі, праводзілі вялікую асьветніцкую працу. Маці, Глафіра Сьцяпанаўна, захаплялася мастацтвам і малявала сама. А для бацькі не было такога музычнага інструменту, на якім бы ён не мог іграць. Аднак любімым заняткам Пятра Іванавіча былі пісанкі. Іх ён лічыў сімвалам адраджэньня, увасабленьнем новага жыцьця. Распісваў іх на спецыяльных прыладах, штатыўчыках, якія сам рабіў. Памятае Галіна Пятроўна і тое, як бацька прыстасоўваў яйка да грамафону, і калі яно круцілася -- маляваў.

-- Пісаначкі, -- вучыў ён, -- павінны быць такія ж яркія і паласаценькія, як спадніцы беларускіх кабет. Асноўныя колеры -- фіялетавы, жоўты, зялёны.

Яскравыя, незабыўныя ўражаньні засталіся ў Галіны Пятроўны ад наведваньня ў юнацкія гады Нясьвіжскага замка Радзівілаў. Там яна ўбачыла дзівосную калекцыю пісанак. Яйкі былі ад розных птушак -- перапёлак, фазанаў, гусей і г.д. Узоры на іх былі самыя неверагодныя. Былі гэта падарункі Радзівілам з розных краін сьвету. Уражанная такой прыгажосьцю, дзяўчына паспрабавала сама рабіць пісанкі. На Вялікдзень яе маляванкам не было роўных.

-- Пісанка -- гэта не проста размаляванае




яйка, -- гаворыць Галіна Пятроўна. -- Кожная зь іх мае свой сэнс, сваё асаблівае значэньне. На іх можна выказаць пажаданьне, прызнацца, напрыклад, у каханьні, альбо наадварот. Белую з чорнай кветачкаю, альбо чорную пісанку раней клалі нябожчыку ў труну. У гаспадарцы -- каню, карове, авечкам, каб добра расьлі, уздоўж па сьпіне вадзілі сьвянцоным яйкам. Яго дадавалі і ў корм птушкам. Ад грому і навальніцы перакідвалі яйкі праз хату. У такім выпадку пажадана, каб на іх была намалявана вясёлка.

З гадамі Галіна Пятроўна заўважала, што сьвеньціць на Вялікдзень людзі прыносяць усё больш чырвоныя яйкі, а пісанкі трапляюцца рэдка. Потым наогул касьцёлы скрозь пазачынялі. Забараняліся рэлігійныя сьвяты. Пачалі забываць і на пісанкі.

Асабістае жыцьцё Галіны Пятроўны таксама складалася не вельмі проста. Адной давялося гадаваць траіх сыноў. Працавала на дзьве стаўкі медыцынскай сястрою ў адной з мінскіх бальніцаў. Цяпер яна сумна жартуе: "Калі працавала на стаўку, не было чаго есьці, а як перайшла на дзьве, то не было калі есьці". Абставіны склаліся так, што цяпер Галіна Пятроўна са сваім мужам, вядомым пісьменьнікам Уладзімірам Дамашэвічам, жыве ў Клецку, у доме, які застаўся ёй ад бацькоў. Усё тут мілае яе душы, бо ўсё з маленства знаёмае і роднае. Але спакою і любімым заняткам перашкаджаюць праблемы, бо прыходзіцца весьці змаганьне за элементарнае выжываньне ў наш няпросты час. Дый не можа Галіна Пятроўна глядзець раўнадушна, калі дзеецца вакол несправядлівасьць.

Калісьці пры Казіміры Вялікім у Клецку было восем касьцёлаў. У фарным касьцёле прапаведаваў нават Сымон Будны. Аднак войны і камуністычны рэжым былі жорсткімі -- з усіх клецкіх касьцёлаў застаўся адзін -- кляштар дамініканаў. Да нядаўняга часу там знаходзілася мэблевая фабрыка. З 1986г. каталікі Клецка пастаянна зьвярталіся ў розныя дзяржаўныя ўстановы з просьбаю вярнуць гэты касьцёл, які афіцыйна зарэгістраваны рыма-каталіцкай парафіяй горада. Адказныя па справах рэлігіі абяцалі гэта зрабіць, як толькі фабрыку перанясуць у іншае месца. І вось нарэшце ёй знайшлі іншае памяшканьне, а сьвятыню перадалі...праваслаўным. Цяпер у Клецку дзьве праваслаўныя царквы, кожны сельскі савет раёна таксама мае сваю царкву. А касьцёла няма ніводнага. Таму каталікі зьбіраюцца для малітваў у хаце Дамашэвічаў. Удзельнічаюць у Сьвятой Імшы, якая перадаецца



ў нядзелю па беларускім радыё. У сваёй хаце Галіна Пятроўна праводзіць і нядзельную каталіцкую школку. Амаль сорак дзетак падрыхтавала яна да Першай Споведзі.

Ідуць людзі ў гэту хату і проста па параду, дапамогу. А калі бывае гаспадыні няма (паехала ў Мінск атрымаць пенсію і праведаць унукаў), муж Уладзімір Максімавіч складае спіс тых, хто прыходзіў і зь якім пытаньнем.

Цяпер Галіна Пятроўна затрымалася ў Мінску. Яна наладжвае выставу сваіх пісанак, што мае адбыцца ў сьвяточныя дні ў касьцёле Сьвятых Сымона і Алены.

Выставы яе цудоўных маляванак неаднойчы праходзілі ў касьцёлах Польшчы. Шмат альбомаў з пісанкамі забіралі ў Канаду. Цікавіліся яе творчасьцю некаторыя нашыя мастакі. Год таму прыязджалі з аднаго творчага цэнтра пераймаць вопыт у Галіны Пятроўны. За гэта абяцалі падараваць фарбаў і пэндзляў (зь імі заўсёды вялікія цяжкасьці, іншы раз Г.П.Дамашэвіч вымушана маляваць палачкамі, вытачанымі з дрэва). Праўда, пра свае абяцаньні мастакі тут жа забыліся. Затое ўпершыню ўбачыла Галіна Пятроўна ў продажы пісанкі, зробленыя ў яе стылі. Прадаваліся яны ў магазіне, што на першым паверсе гасьцініцы "Беларусь". Дома падзялілася з сынам прыемнаю навіною. У адказ пачула: "Дзівачка, людзі грошы на табе зарабляюць..." Аднак шчасьлівая, яна адказала: "Што тыя грошы, радасьць вялікая: пісанкі беларускія жывуць!"

Галіна КАЛЕВІЧ
Фота Юрыя ЗАХАРАВА

ЕЗУ, НАДЗЕЮ Ў ТАБЕ ПАКЛАДАЕМ...

18 красавіка 1993г., у другую Вялікодную нядзелю на плошчы Сьвятога Пятра ў Рыме адбылася беатыфікацыя законнай сястры Фаўстыны Кавальскай. Папа Ян Павел II абвясьціў новае імя благаславёнай.

З гэтага часу тыдзень, які па традыцыі называецца Белым, ва ўсім сьвеце будзе праводзіцца Касьцёлам як Тыдзень Міласэрнасьці Божай.

БОГ ШЧОДРЫ МІЛАСЭРНАСЬЦЮ

"Касьцёл абвяшчае праўду аб Божай Міласэрнасьці, аб'яўленай ва ўкрыжаваным і ўваскрослым Хрыстусе і вызнае яе рознымі спосабамі. Касьцёл таксама імкнецца праявіць міласэрнасьць да людзей праз людзей, бачачы ў гэтым непазьбежную ўмову клопатаў пра лепшы, "больш людзкі", сьвет сёньняшняга і заўтрашняга дня. Але ніколі на працягу ўсёй гісторыі - і асабліва ў такі пераломны перыяд як наш - Касьцёл не можа забыць пра малітву, якая зьяўляецца просьбаю аб міласэрнасьці Бога з-за шматаблічнасьці зла, якое навісла над чалавецтвам і якое яму пагражае. Гэта - асноўнае права і адначасова абавязак Касьцёла ў Езусе Хрыстусе. Яно зьяўляецца правам і абавязкам Касьцёла паводле Бога і адначасова ў адносінах да людзей. Чым больш людзкая сьвядомасьць, падпарадкоўваючыся секулярызацыі, страчвае адчуваньне сэнсу самога слова "міласэрнасьць" - чым больш, аддаляючыся ад Бога, аддаляецца ад таямніц міласэрнасьці - тым больш Касьцёл мае права і абавязак зьвяртацца да Бога міласэрнасьці зь "вялікаю просьбаю". Такою "вялікаю просьбаю" павінна быць просьба Касьцёла нашага часу да Бога аб міласэрнасьці, надзейнасьць якога ён абвяшчае і вызнае ў Хрыстусе ўкрыжаваным і ўваскрослым - г.зн. у таямніцы пасхальнай. Гэтая таямніца нясе ў сабе найглыбейшае аб'яўленьне міласэрнасьці - г.зн. тае любові, якая мацнейшая за сьмерць, мацнейшая за грэх і зло кожнага - любові, якая падымае чалавека з найбольшых упадкаў і вызваляе з найбольшай небясьпекі...

У Імя Езуса Хрыстуса укрыжаванага і ўваскрослага, у духу Яго месійнага пасланьніцтва, якое працягваецца ў гісторыі чалавецтва, уздымаем свой голас і просім, каб яшчэ раз на гэтым этапе гісторыі аб'явілася тая Любоў, якая ёсьць у Айца, каб за справаю Сына і Духа Сьвятога аказалася прысутнаю ў нашым сучасным сьвеце - мацнейшая за зло, мацнейшая за грэх і сьмерць. Просім праз пасрэдніцтва Марыі, якая не перастае абвяшчаць "міласэрнасьць з пакаленьня ў пакаленьне", а таксама ўсіх тых, на кім да канца споўніліся словы з Нагорнай пропаведзі: Благаславёныя міласэрныя, бо яны атрымаюць міласэрнасьць". (з Энцыклікі Яна Паўла II аб Божай Міласэрнасьці, разьдз.VII, № 15).



О Кроў і Вада, якая выплыла з Сэрца Езусавага, як струмень Міласэрнасьці для нас, надзею ў Табе пакладаем! (Дз. 187)

НАБАЖЭНСТВА ДА БОЖАЙ МІЛАСЭРНАСЬЦІ

"Скажы спакутаванаму чалавецтву, няхай прытуліцца да Міласэрнага Сэрца Майго, і Я напоўню яго спакоем (Дз.1074). *Чалавецтва не знойдзе супакою, пакуль з даверам не зьвернецца да Маёй Міласэрнасьці"* (Дз.300).

Гэтыя словы Пана Езуса, прамоўленыя да с.Фаўстыны ў трыццатыя гады нашага стагодзьдзя, адкрываюць праўдзівую прычыну глыбокай трывогі многіх людзкіх душаў.

Гэтая маладая законьніца была сьціплаю і малавядомаю ў сваім асяродзьдзі. Але праз дзесяць гадоў пасьля яе сьмерці пра сястру Фаўстыну даведаліся ва ўсім сьвеце. За некалькі гадоў да сваёй сьмерці сястра Фаўстына пісала: "Я выразна адчуваю, што мая місія не скончыцца з маёй сьмерцю, а толькі пачнецца. О душы, якія сумняваюцца, я адкрыю вам заслону неба, каб вас пераканаць у дабрыні Бога, каб вы ўжо больш не ранілі недаверам Наймілейшага Сэрца Езуса. Бог - гэта Любоў і Міласэрнасьць"(Дз.281).

Так пажадаў Усемагутны Бог, каб праз пасрэдніцтва сястры-законьніцы, заўсёды пакорнай Яго Волі і Ласцы, аб'явіліся сьвету новыя формы ўшанаваньня Бога як Бога Міласэрнасьці, бо гэтае ўшанаваньне, якое здавён існавала ў Касьцёле, цяпер амаль забыта.

"Сёньня Я пасылаю цябе да ўсяго чалавецтва з Маёй Міласэрнасьцю" (словы Езуса да с.Фаўстыны).

АПОСТАЛКА МІЛАСЭРНАСЬЦІ БОЖАЙ

Гэлена Кавальская (Фаўстына - манаскае імя) нарадзілася ў в.Глаговец каля Лодзі. Яна была трэцім дзіцем зь дзесяці ў сям'і Кавальскіх. Калі Гэлене ішоў дваццаты год, яна ўступіла ў Кангрэгацыю Сясьцёр Божай Маці Міласэрнасьці. Сёстры гэтай Кангрэгацыі прысьвячалі сябе, у асноўным, крапатлівай працы з тымі дзяўчатамі, жыцьцё якіх выклікала найбольшую трывогу.

Паслухаўшыся парады свайго душпастыра, сястра Фаўстына пачала весьці Дзёньнік, які насіў назву "Божая Міласэрнасьць у маёй душы". Гэта падрабязнае апісаньне рэлігійных практыкаваньняў і надзвычайных духоўных дасьведчаньняў адкрывае нам, якім чынам Пан Езус даверыў ёй спецыяльную місію абвяшчэньня сьвету пасланьня і новых формаў набажэнства да Божай Міласэрнасьці.

Сястра Фаўстына памерла ад сухотаў у 1938г., калі ёй было 33 гады. Перад сьмерцю прадказала пачатак Другое Сусьветнае вайны і ўвесь яе жах.

АБРАЗ ПАНА ЕЗУСА - "ЕЗУ, НАДЗЕЮ Ў ТАБЕ ПАКЛАДАЮ"

Місія сястры Фаўстыны распачалася ў 1931г., калі Пан Езус аб'явіўся ёй. Яна ўбачыла Пана Езуса ў белым адзеньні. Яго правая рука была ўзьнята для благаславеньня, а левую Ён прыціскаў да грудзей, адкуль зыходзілі два вялікія промні: чырвоны і белы. Пан Езус прамовіў да с.Фаўстыны: "*... намалюй абраз, які бачыш, і зрабі подпіс: Езу, надзею ў Табе пакладаю... Абяцаю, што душа, якая будзе ўшаноўваць гэты абраз, не згіне. Абяцаю ёй таксама ўжо тут, на зямлі, перамогу над непрыяцелямі, і асабліва ў часіну сьмерці. Я Сам буду ахоўваць яе як Сваю хвалу*" (Дз.47). "*Я даю людзям начыньне, зь якім яны павінны прыходзіць па ласку да Крыніцы Міласэрнасьці. Гэтым начыньнем зьяўляецца абраз з надпісам "Езу, надзею ў Табе пакладаю*" (Дз.327).

Сястра Фаўстына, па просьбе душпастыра, запытала Пана Езуса, якое значэньне маюць промні на абразе. У часе малітвы пачула адказ: "*Гэтыя два прамяні азначаюць Кроў і Ваду; празрысты прамень азначае Ваду, якая апраўдвае душы; чырвоны прамень азначае Кроў, якая зьяўляецца жыцьцём душаў... Гэтыя два прамяні выйшлі з глыбіні Маёй Міласэрнасьці ў той момант, калі Маё канаючае Сэрца было прабіта дзідаю на крыжы... Шчасьлівы, хто ў іх сьвятле жыць будзе, бо не дасягне яго справядлівая рука Бога*" (Дз.299)

СЬВЯТА БОЖАЙ МІЛАСЭРНАСЬЦІ

"*Прагну, каб першы тыдзень пасьля Вялікадня быў Сьвятам Міласэрнасьці*" (Дзёньнік 299)

Пан Езус выказаў гэтае пажаданьне першы раз у Плоцку ў 1931г., калі перадаваў Сваю Волю наконт стварэньня абраза Божай Міласэрнасьці. Потым Езус паўтарыў гэтае пажаданьне ажно чатырнаццаць разоў, акрэсьліваючы месца гэтага сьвята ў літургічным календары, прычыну і мэту яго ўстанаўленьня, а таксама спосаб падрыхтоўкі і правядзеньня.

Выбар першай нядзелі пасьля Вялікадня, якая заканчвае актаву Зьмёртвыхпаўстаньня Панскага, указвае на цесную сувязь паміж вялікоднаю таямніцаю Адкупленьня і Сьвятам Міласэрнасьці. Бо Мука, сьмерць і ўваскрашэньне Хрыстуса зьяўляюцца найвышэйшым аб'яўленьнем Міласэрнай Любові Бога. Справа Адкупленьня актуальная і дае плён у Сьвятых Сакрамантах, пра якія гаворыцца ў Літургіі Слова Сьвята Міласэрнасьці. Хрышчэньне, Сакрамант пакаяньня, Эўхарыстыя - гэта невычарпальныя крыніцы Божай Міласэрнасьці, да якіх па ўсёй зямлі, усе пакаленьні вядзе Сьвяты Касьцёл. Таму Літургія гэтай нядзелі зьяўляецца кульмінацыяй праслаўленьня Пана Бога ў таямніцы Міласэрнасьці.

Сьвята Божай Міласэрнасьці павінна быць не толькі днём асаблівага ўшанаваньня Бога ў гэтай таямніцы, але і днём ласкі для ўсіх людзей, асабліва для грэшнікаў. "*Прагну, - сказаў Пан Езус, - каб Сьвята Міласэрнасьці было паратункам і прытулкам для ўсіх душаў, асабліва для бедных грэшнікаў* (Дз.699). *Хто ў гэты дзень прыступіць да споведзі* і Сьвятой Камуніі, атрымае цалкавітае адпушчэньне грахоў і выбаўленьне ад пакараньня... Няхай жа ніводная душа не баіцца наблізіцца да Мяне, - калі нават грахі яе былі, як пурпур*"...(Дз. 699)

Каб атрымаць з гэтых вялікіх дароў, трэба выканаць умовы набажэнства да Міласэрнасьці Божай, г.зн. пакладаць надзею ў Пану Богу, рабіць учынкі міласэрнасьці, быць у стане асьвячальнай ласкі (пасьля сьвятой споведзі) і прыступіць да Крыніцы жыцьця - да Сьвятога Прычасьця.

"*Пішы аб Маёй Міласэрнасьці. Раскажы душам, дзе ім трэба шукаць суцяшэньня, - гэта значыць, у трыбунале Маёй Міласэрнасьці, там знаходзяцца найбольшыя цуды, якія няспынна паўтараюцца... дастаткова зь вераю ўкленчыць перад наступнікам Маім і расказаць яму аб сваёй бядзе, і цуд Міласэрнасьці Божай праявіцца ва ўсёй паўнаце. Нават, хоць бы душа была ўжо, як труп, які раскладаецца, і ў людзкім разуменьні ўваскрашэньне яе здавалася б немагчымым, а ўсё - страчаным, - для Бога гэта зусім не так: цуд Міласэрнасьці Божай уваскрашае такія душы ва ўсёй паўнаце*" (Дз.1448).

"*Калі ідзеш да споведзі, ведай, што Я Сам чакаю цябе ў канфесіянале, і хоць засланяюся сьвятаром, але Сам дзейнічаю ў душы. Тут убоства душы сустракаецца з Богам Міласэрнасьці. Скажы душам, што з гэтай Крыніцы Міласэрнасьці ласкі чэрпаюць толькі начыньнем даверу. Калі давер іх будзе вялікім, шчодрасьці Маёй няма межаў*"(Дз.1602).

Пан Езус абяцаў: "*Душы, якія пашыраюць пашану Маёй Міласэрнасьці, Я аберагаю праз усё жыцьцё, як клапатлівая маці сваё немаўлятка, а ў часіну сьмерці Я не буду для іх Судзьдзёю, але Міласэрным Збаўцелем.*" (Дз.1075)

"*Я даю табе тры спосабы, як рабіць дабро бліжнім: першы - учынак, другі - слова і трэці - малітва* (Дз.742). *Калі душа хоць бы якімсьці чынам не будзе тварыць міласэрнасьці , яна не атрымае Маёй Міласэрнасьці ў Судны дзень. О, калі б душы ўмелі зьбіраць сабе вечныя скарбы, то яны не былі б судзімыя, бо судам папярэднічае Мая Міласэрнасьць*" (Дз.1317).

"*Ніводная душа не знойдзе апраўданьня, - сказаў Пан Езус, - пакуль не зьвернецца з даверам да Маёй Міласэрнасьці, і таму першая нядзеля пасьля Вялікадня павінна быць Сьвятам Міласэрнасьці, і сьвятары ў гэты дзень мусяць гаварыць душам пра так вялікую і бязьмежную Маю Міласэрнасьць*" (Дз. 570). Падрыхтоўкаю да Сьвята Міласэрнасьці павінна быць Навэнна, якую Пан Езус наказаў с.Фаўстыне адпраўляць дзевяць дзён (пачынаючы ад Вялікай Пятніцы).

*да споведзі можна прыступаць за некалькі дзён да Сьвята Божай Міласэрнасьці, ці, калі гэта раней было немагчыма, то адразу пасьля сьвята.

1 ***Сьв.Тэадоры***

З грэц. theo -- Бог і doron -- дараваны. Памерла пакутніцкай сьмерцю за веру к.117г.

Сьв.Хугона

З герм. hegu -- розум і талент. Жыў у 1052-1132гг. Быў біскупам Грэнобля. Па яго ініцыятыве ўзьнікла вядомае абацтва картузаў La Grande Charteuse.

Гражыны

Гэтае імя не мае апекуна. Стварыў яго А.Міцкевіч: ад літ. grazus -- прыгожы.

2 ***Пятая нядзеля Вялікага Посту***

Сьв.Францішка з Паалі

З герм. frank -- чалавек з племені Франкаў, вольны. Нарадзіўся ў Калабрыі ў 1416г. Францішканін зь Італіі, вядомы жорсткай аскезай. Памёр як пустэльнік у Францыі ў 1507г.

Сьв.Тэадозіі

З грэц. theo -- Бог і do -- даць. Мучаніца, утопленая ў Цэзарэі к.307г.

3 ***Сьв.Сыкстуса***

З грэц. ksystos -- выпрасаваны. Быў Папам, яго пантыфікат ахоплівае 116-125гг.

Сьв.Ульпяна

Старажытнарымскае імя. Юнак з Туру, які памёр як мучанік у першых стагодзьдзях хрысьціянства (выкінуты ў мора, зашыты ў мяшок разам з сабакам і зьмяёю).

Сьв.Рышарда дэ Выхэ

З герм. rich -- валадар і hard -- дужы. Канцлер оксфардскага універсітэту, таксама дыяцэзіяльны канцлер арцыбіскупа Кантэрбуры, Сьв.Эдварда, а потым быў біскупам Чычэстэру. Памёр у 1253г.

4 ***Сьв.Ізыдора***

Ад Izys -- егіпецкая багіня Луны і з грэц. doron -- дар. Быў біскупам Севільі і рэлігійным пісьменьнікам, доктар Касьцёла. Жыў у 554-636гг. Аб ім захаваліся розныя легенды, адна зь іх гаворыць, што калі ён нарадзіўся, пчолы прынесьлі яму на вусны мёд, гэта было знакам таго, што нованароджаны будзе выдатным прапаведнікам.

Вацлава

5 ***Сьв.Ірэны***

З грэц. Eirene -- багіні спакою. Мучаніца з Тэсалонікі (цяпер Салонікі), якая за тое, што чытала рэлігійныя кнігі, была зьняволена і памерла пакутніцкай сьмерцю разам са сваімі сёстрамі Агапай і Хьёніяй. Каты перш загналі яе ў публічны дом, а потым замардавалі.

Сьв.Юльяны з Карнілон

Старажытнарымскае імя. Жыла ў 1193-1258гг. Была законьніцаю, аўгустынкаю, абацісаю. Пасадзейнічала зацьвярджэньню Апостальскаю Сталіцаю сьвята Божага Цела.

Сьв.Вінцэнта Фэрэрыя

З лац. vincens -- пераможны. Родам з Іспаніі, быў дамініканінам, найвялікім пакутніцкім прапаведнікам сярэднявечча. Памёр у 1419г. Зьяўляецца апекуном будаўнікоў.

6 ***Сьв.Марцэлія***

Старажытнарымскае імя. Паходзіў з Картагіны і быў сябрам Сьв.Аўгустына. З прысуду судзьдзі быў пакараны разам з братам у 413г.

Сьв.Прудэнцыя

З лац. prudens -- разумны. Быў іспанцам, біскупам Троі. Памёр у 861г.

Сьв.Вільгельма

З герм. wille -- жаданьне, воля і heim -- апека. Француз, манах з закону канонікаў рэгулярных, на працягу 30 гадоў працаваў у Даніі. Памёр у 1203г.

7 ***Сьв.Яна Хрысьціцеля дэ ля Сале***

Біблійнае імя, азначае -- Бог ёсьць ласкавы. Жыў у 1651-1719гг. Быў французкім сьвятаром, займаўся выхаваньнем бедных дзяцей і арганізоўваў настаўніцкія семінарыі. Заснаваў карпарацыю Братоў Школьных. Зьяўляецца апекуном выхавальнікаў.

Пчэцлава

8 ***Сьв.Дыаніза з Карынту***

З грэц. Dionizos -- бажок забавы. Біскуп з Грэцыі, мучанік, памёр к.180г.

Сьв.Вальтэра з Пантоіс

З герм. walt -- кіраваць і har -- войска. З Францыі, быў абатам бенедыктынаў, памёр у 1095г.

Сьв.Юліі Білярт

Старажытнарымскае імя. Жыла ў 1751-1816гг. Была францускаю законьніцаю, заснавала закон Сёстраў Notre-Dame.

Радаслава

9 **Пальмовая нядзеля Мукі Панскай**

Сьв.Марыі Клеафасавай

Вядома з Евангельля. Адна з жанчын, якія стаялі пад крыжам Езуса, націрала цела Хрыстуса перад пахаваньнем.

Сьв.Хеліядора

З грэц. helios -- сонца і doron -- дар. Быў біскупам, памёр разам з групаю хрысьціян у няволі ў Персіі.

Сьв.Дымітра

Грэц. Demeter -- багіні палявых пладоў. Паходзіў з Тэсалонікі (цяпер Салонікі), памёр пакутніцкай сьмерцю на пераломе III і IV стагодзьдзяў.

10 **Панядзелак Вялікага Тыдня**

Сьв.Паладзія

Быў абатам, а таксама біскупам Аўксэрэ (Францыя). Памёр у 660г.

Сьв.Фульберта

З герм. volk -- люд і berth -- слаўны. Біскуп Харатрэс, які адбудаваў вядомую катэдру ў гэтым горадзе, пакінуў пасьля сябе рэлігійныя пісьмы. Памёр у 1028г.

Міхала

11 **Аўторак Вялікага Тыдня**

Сьв.Піліпа

З грэц. philippeo -- сябра. Быў біскупам Крэты.

12 **Серада Вялікага Тыдня**

Сьв.Зянона

Імя паходзіць ад Zeus, грэцкага бога. Быў біскупам Вероны, памёр к.371г.

Сьв.Юлія

Старажытнарымскае імя. Быў Папам, памёр у 352г.

13 **Вялікі Чацьвер**

Сьв.Герменегільда

Герм. імя. Сын караля Візіготаў, Леавігільда. Не паслухаў бацькі, калі той пажадаў, каб ён выракся каталіцызму. У выніку здрады быў схоплены войскам бацькі і зьняволены. У турме яму адсеклі галаву ў 585г.

Сьв.Марціна I

З лац. martius -- прыналежны да Марса, бога вайны. Нарадзіўся ў Умбрыі. Быў сьвятаром рымскага Касьцёла, а потым стаў Папам (649-656гг.). Перасьледаваны цэзарам Канстанцінам II, памёр пакутніцкай сьмерцю ў ссылцы ў Херсонэсе ў 656г.

Сьв.Іды

Герм. ад біблійнага імя Юдыта. З Лоўвайн, была законьніцаю-цыстэркаю. Памерла к.1300г.

Прэмыслава

14 **Вялікая Пятніца**

Сьв.Валяр'яна

Старажытнарымскае імя. Быў братам Сьв.Тыбурцыя і нарачоным Сьв.Цэцыліі. Памёр пакутніцкай сьмерцю ў II ці III стагодзьдзі.

Сьв.Тыбурцыя

Старажытнарымскае імя. Мучанік, загінуў у Рыме ў II ці III стагодзьдзі.

15 **Вялікая Субота**

Сьв.Анастазіі

З грэц. anastasis -- зьмёртвыхпаўстаньне. Была рымлянкай, памерла пакутніцкай сьмерцю ў гады Нерона. Разам зь ёй загінула **Сьв.Базыліса** (з грэц. basilissa -- жонка караля-базілеўса).

Сьв.Людвіны

З герм. liud -- люд і win -- сябра. Вядомая сваёю прыгажосьцю. Жыла ў 1380-1433гг. Была паралізавана, да канца жыцьця вельмі цярпела.

16 **Нядзеля Зьмёртвыхпаўстаньня Панскага**

Сьв.Бернадэты Сабірас

Нарадзілася ў 1844г. у Люрдзе. 11 лютага 1858г. у гроце Масабэльскім ёй першы раз аб'явілася Маці Божая. Бернадэта знаходзілася ў прытулку, а 1866г. уступіла ў Кангрэгацыю Сёстраў Любові і хрысьціянскага

выхаваньня ў Сант-Гілардзе. Як сястра Марыя Бернарда прабывала там да сьмерці (16 красавіка 1879г.).

Сьв.Бенедыкта Лябрэ

Дзень малітваў за Сьвятога Айца

17 ***Панядзелак Вялікодны***

Сьв.Ільлі і яго паплечнікаў

Біблійнае імя, азначае -- Бог мой вялікі. Быў сьвятаром, закатаваны ў 856г. у Кэрдобе разам з двумя законьнікамі, Паўлам і Ізыдорам.

Сьв.Роберта

З герм. rot, rod -- слава і berth -- знакаміты. Заснавальнік і абат закону цыстэрсаў. Быў французам Памёр у 1067г.

Сьв.Стэфана Хардынга

З грэц. stephanos -- карона, вянец. З Англіі, таксама быў цыстэрсам. Памёр у 1134г.

18 ***Сьв.Апалонія***

З грэц. apolonios -- прыналежны да бога Апалона. Быў рымскім сенатарам. Выдадзены сваімі рабамі, яму адсеклі галаву за веру к.190г.

Сьв.Эльпідзія

З грэц. elpis -- надзея. Быў мучанікам, загінуў у першыя стагодзьдзі хрысьціянства. Паходзіў з Арменіі.

Гасьціслава, Багуславы

19 ***Сьв.Цімона***

Грэцкае імя. Адзін з сямі першых дыяканаў Касьцёла. Мучанік, загінуў у I ст., укрыжаваны ў Карыньце.

Сьв.Экспедыта

З лац. ekspeditus -- вольны, хуткі. Мучанік, загінуў у 303г.

Сьв.Леон IV

З грэц. leon -- леў. Жыў у 1002-1054гг. Быў Папам, арганізаваў курыю ватыканскую..

20 ***Сьв.Тэадора***

Быў біскупам Анастазіопаля. Памёр у 613г.

Сьв.Агнешкі

Ад hagnos -- чысты, сьвяты. Італьянка, была абацісаю закону damінікaнак у Працэна, вядома сваімі прароцтвамі. Памерла ў 1317г.

Сьв.Берэнікі

Грэцкае імя, азначае -- тая, якая прыносіць перамогу. Маладая жыхарка Аньціохіі; загінула ў часы цэзара Дыаклецыяна, кінулася ў раку разам з маці і сястрою, каб пазьбегнуць зьнявагі з боку наймітаў.

Сьв.Мар'яна

Старажытнарымскае імя. Французкі законьнік. Памёр у 489г.

21 ***Сьв.Анзельма***

Герм. ans -- ідал, бажок і helm -- шлем. Жыў у 1033-1109гг. Паходзіў з Італіі. Доктар Касьцёла, вядомы як арцыбіскуп Кантэрбуры (Англія) і вучоны бенедыктынец, філосаф, напісаў шмат аскетычных, дагматычных вучоных прац.

Сьв.Конрад

Герм. kuoni -- смелы і rot -- рада. З Баварыі. Жыў у 1818-1894гг. Як капуцын больш за 40 гадоў быў брамнікам кляштару ў Алтацінгу -- месца слыннага адпустамі.

22 ***Сьв.Сьв. Сотэра і Каюса***

Сотэр: з грэц. soter -- збаўца, Каюс -- старажытнарымскае імя. Два Папы, мучанікі, якія загінулі ў першыя стагодзьдзі хрысьціянства.

Сьв.Леаніда

Грэц. leon -- леў. Айцец вядомага хрысьціянскага філосафа Арыгенэса. Сам таксама быў філосафам. За веру яму адсеклі ў 202г. у Александрыі.

23 ***Другая нядзеля Вялікодная***

Сьв.Войцаха

Апякун Польшчы. Нарадзіўся к.956г. Быў сынам чэшскага ўладара Слаўніка. Пасьля сьмерці першага біскупа Прагі -- Дытмара, быў яго пасьлядоўнікам і стаў біскупам. З-за спрэчкі з князем быў вымушаны двойчы выязджаць са сваёй сталіцы. Апошні раз гэта было ў 995г., калі былі замардаваны чатыры яго браты. Схаваўся тады ў Польшчы, дзе быў прыняты Баляславам Храбрым. Выехаў на Балтыку навяртаць у веру прусаў. Але памёр сьмерцю мучаніка 23 красавіка 997г., быў прабіты сямю коп'ямі.

24 Сьв.Юры (Георгія)

Грэц. georgos -- земляроб. Жыў у часы Дыаклецыяна. Зьяўляецца апекуном Англіі і скаўтаў. Малююць яго звычайна, як ён змагаецца з драконам, яго гербам зьяўляецца чырвоны крыж на белым тле. Ён таксама -- апякун земляробаў, збройнікаў, кавалеры, рыцараў, салдат. Дапамагае пры хваробах скуры, праказы, пры ўкусах зьмеяў, эпідэміях.

Сьв.Фідэліса

Лац. fidelis -- верны. Швейцарскі капуцын. Жыў у 1578-1622гг. Быў замардаваны іншаверцамі. Апякун юрыстаў.

25 Сьв.Марка Евангеліста

Лац. marcus -- які належыць да бога вайны, Марса. Вядомы з Новага Запавету, аўтар Евангельля. Разам з Сьв.Паўлам быў у спадарожжы, а потым зь ім пайшоў у Рым. Стаў вучнем апостала Пятра, напісаў пра яго навуку ў сваім Евангельлі. У канцы жыцьця быў біскупам Александрыі. Памёр як мучанік у часы цэзара Траяна. Лічыцца апекуном пісьменьнікаў, муляраў, натарыусаў, а таксама збожжа.

Яраслава

Гэтае імя не мае апекуна. Паходзіць ад праславянскага jaro -- востры, суровы і slaw(a).

26 Сьв.Клета

З грэц. kletos -- абраны.

Сьв.Айрэлія

Старажытнарымскае імя. Мучанік з Аксіаполіса, загінуў у 88г.

Сьв.Марцэліна

Старажытнарымскае імя. Быў Папам. Яго пантыфікат (296-304гг.) прыпаў на перыяд вялікіх перасьледаваньняў хрысьціян. Памёр сьмерцю мучаніка ў 304г.

27 Сьв.Феліцыі

Лац. felix -- шчасьлівы, ураджайны. Мучаніца зь Нікамедыі; загінула ў 302г. у часы валадарства цэзара Дыаклецыяна.

Сьв.Тэафіла

Грэц. theos -- Бог і philos -- сябра. У 439-455гг. быў біскупам Брыксена (паўднёвы Тыроль).

Сьв.Зыты

Італ. zitta -- дзяўчына. Жыла ў 1218-1272гг. Італьянка, служыла ў адным доме на працягу 40 год. Апякунка хрысьціянскіх таварыстваў служачых.

Благасл.Юзафа Маскаці

Біблійнае імя, азначае -- няхай Бог дасьць сына. Італьянец, меў вялікія заслугі як лекар і прафесар медыцыны ў Неапалі. Жыў у 1880-1922гг.

28 Сьв.Людвіка

Герм. hlud -- слаўны і wig -- бітва. Жыў у 1673-1716гг. Французкі езуіт, вядомы аскетычным жыцьцём, культам ружанца і місійнаю працаю. Аўтар "Трактату аб праўдзівым набажэнстве да Найсьвятой Марыі Панны".

Сьв.Пятра Ханэлі

Грэц. petros -- скала. Нарадзіўся ў Францыі ў 1803г. Сьвятар і мучанік, місіянер. Загінуў на выспе Футума (Акеанія), замардаваны туземцамі ў 1841г.

29 Сьв.Пятра з Вероны

Жыў у 1206-1253гг., дамініканін. Паў ахвяраю катаў; паміраючы, напісаў на муры сваёю крывёю credo -- веру.

Сьв.Кацярыны Сіенскай

Дамініканка, паходзіла з Сіены (Італія). Жыла ў 1347-1380гг. Яе жыцьцё прыпала на цяжкія для Касьцёла гады авіньёнскай няволі. Кацярына пісала да Папы, нават была ў Авіньёне. Схіляла іх да Рымскай сталіцы Сьв.Пятра. Навяртала людзей да малітвы за сапраўднага Папу і за аднаўленьне жыцьця Касьцёла. Доктар Касьцёла. Для прызнаньня яе асабістых заслуг Пій IX абвясьціў яе другой пасьля Сьв.Пятра апякункай Рыму, а Пій XII -- другой, разам з Сьв.Францішкам з Асізі, апякункай Італіі.

Багуслава

30 Трэцяя нядзеля Вялікодная

Сьв.Пія V

Лац. pius -- набожны. Нарадзіўся ў 1504г. Быў Папам, памёр у 1572г. Вядомы як рэфарматар Касьцёла.

Сьв.Даната

Лац. donatus -- даны. Біскуп з Эварэі (Грэцыя), жыў у IVст.

"...убачыла вялікае зьзяньне і ў ім - Бога Айца. Між гэтым зьзяньнем і зямлёю я ўбачыла Езуса, прыбітага да Крыжа так, што Бог, хочучы ўзглянуць на зямлю, павінен глядзець праз Раны Езуса" (Дз.60)

КАРОНКА ДА МІЛАСЭРНАСЬЦІ БОЖАЙ

"*...нястомна чытай гэтую каронку, якой Я цябе навучыў. Хто будзе яе чытаць, атрымае вялікую міласэрнасьць у часіну сьмерці. Сьвятары будуць падаваць грэшніку (яе) як апошнюю выратавальную саломінку; і хоць бы быў гэта самы зацьвярдзелы грэшнік, калі толькі раз адгаворыць гэтую каронку, - атрымае ласку з Маёй бясконцай Міласэрнасьці. Прагну, каб увесь сьвет пазнаў Міласэрнасьць Маю; прагну ўдзяліць неспасьцігальную ласку душам, якія спадзяюцца на Маю Міласэрнасьць*".(Словы Пана Езуса да сястры Фаўстыны Марыі Кавальскай Дз.687).

Каронка чытаецца на Ружанцы

Напачатку:

Ойча наш..., Вітана будзь, Марыя..., Веру ў Бога...

На вялікіх пацерках:

Ойча Спрадвечны, ахвярую Табе Цела і Кроў, Душу і Боскасьць Наймілейшага Сына Твайго і Пана нашага, Езуса Хрыстуса, каб перапрасіць за грахі нашы і ўсяго сьвету.

На малых пацерках:

Дзеля Яго Балеснай Мукі будзь міласэрны да нас і ўсяго сьвету.

На заканчэньне:

Сьвяты Божа, Сьвяты Моцны, Сьвяты Несьмяротны, зьмілуйся над намі і над усім сьветам! *(3 разы)*

"...Бо ў гэтую хвіліну Яна (Міласэрнасьць) насьцеж адкрылася для кожнай душы... У гэтую гадзіну прыйшла Ласка для ўсяго сьвету - Міласэрнасьць перамагла справядлівасьць" (Дз.1572).

НАВЭННА ДА БОЖАЙ МІЛАСЭРНАСЬЦІ

Зь Дзёньніка благаславёнай сястры Фаўстыны вынікае, што Пан Езус выказаў жаданьне, каб Сьвята Міласэрнасьці ўвесь Касьцёл ўрачыста абыходзіў у першую нядзелю пасьля Вялікадня (якая цяпер называецца другою Велікоднаю нядзеляю). У Дзёньніку таксама запісана, што гэтаму сьвяту павінна папярэднічаць Навэнна. Пан Езус выразна просіць с.Фаўстыну, каб занатавала Навэнну, якую Ён прадыктуе, і каб яна чытала гэтую Навэнну перад Сьвятам Міласэрнасьці ў 1937г. Гэты тэкст разышоўся па ўсім сьвеце на працягу аднаго дзесяцігодзьдзя пасьля сьмерці с.Фаўстыны (памерла 5 кастрычніка 1938г.).

У Дзёньніку пад № 1205 чытаем: *Езу, надзею ў Табе пакладаю*. Крыху ніжэй на гэтай жа старонцы напісаны загаловак: *Навэнна да Божай Міласэрнасьці, якую Езус загадаў мне запісаць і адправіць перад Сьвятам Божай Міласэрнасьці, распачынаецца ў Вялікую Пятніцу.*

І адразу за гэтаю назваю запісаны пажаданьні Пана Езуса, як павінна с.Фаўстына адпраўляць гэтую Навэнну; абяцаньне Пана Езуса, якое споўніцца пры ўмове адпраўленьня гэтай Навэнны, а таксама тэкст штодзённых інтэнцый, прадыктаваных Панам Езусам, і малітваў, складзеных сястрою Фаўстынаю пад нахненьнем Езусавых інтэнцый.

У сьнежні 1936г. Пан Езус папрасіў с.Фаўстыну, каб прыгатавалася да Сьвята Міласэрнасьці, адпраўляючы Навэнну, якая складаецца з каронкаў да Божай Міласэрнасьці. Як чытаць каронку, Пан Езус навучыў яе раней, а менавіта 14 верасьня 1935 году. Да гэтай Навэнны каронкаў Пан Езус дадаў абяцаньне: *У гэтай Навэньне ўдзялю душам усялякай Ласкі* (Дз. 796).

Пан Езус, як запісана ў Дзёньніку, прасіў адпраўляць Навэнну не толькі як прыгатаваньне да Сьвята Міласэрнасьці, але і з мэтаю перапрашэньня Бога Айца і як просьбу аб міласэрнасьці. Навэнна павінна была быць адпраўлена с.Фаўстынаю і іншымі. Тады ж была таксама рэкамендавана ўякасьці галоўнай малітвы каронка.

З многіх тэкстаў, зьмешчаных у Дзёньніку, вынікае, што Пан Езус вельмі прасіў чытаць гэтую Навэнну, і асабліва прагнуў, каб яе чыталі з мэтаю асаблівай падрыхтоўкі да Сьвята Міласэрнасьці.

"А трэцяй гадзіне прасі Маёй Міласэрнасьці, асабліва для грэшнікаў, і хоць на момант пагрузіся ў Маю Муку, асабліва ў Маю самоту ў часіну кананьня. Гэта - часіна вялікае Міласэрнасьці для ўсяго сьвету... у гэты час Я ні ў чым не адмоўлю душы, якая будзе прасіць Мяне праз Муку Маю"... (Дз.1320).

Дзёньнік, №1209:

Навэнна да Божай Міласэрнасьці, якую Езус наказаў мне запісаць і адправіць перад Сьвятам Міласэрнасьці. Распачынаецца Навэнна ў Вялікую Пятніцу.

Прагну, каб праз усе гэтыя дзевяць дзён ты прыводзіла душы да крыніцы Маёй Міласэрнасьці, каб яны зачэрпнулі сілы і прахалоды, і ўсялякае ласкі, якой патрабуюць у жыцьцёвых цяжкасьцях, і асабліва ў часіну сьмерці. Кожны новы дзень будзеш прыводзіць да Майго Сэрца іншую групу душаў і будзеш акунаць іх у гэтым моры Маёй Міласэрнасьці. А Я ўсе гэтыя душы ўвяду ў дом Айца Майго. Гэтак будзеш рабіць ў жыцьці часовым і ў будучым. І Я ні ў чым не адмоўлю ніводнай душы, якую ты прывядзеш да крыніцы Маёй Міласэрнасьці. Кожны дзень будзеш прасіць у Айца Майго ласкі для гэтых душаў праз Маю горкую Муку.

"Я адказала: Езу, не ведаю, як гэтую Навэнну адправіць і якія душы найперш увесьці ў Тваё Найлітасьцівае Сэрца. Езус адказаў, што Ён скажа мне, якія душы мушу ўводзіць кожны дзень у Ягонае Сэрца" (Дз. 1209).

Дзень першы

К. (Ксёндз) *Словы Пана Езуса да сятры Фаўстыны: сёньня прывядзі да Мяне ўсё чалавецтва, і асабліва ўсіх грэшнікаў, і акуні іх у моры Маёй Міласэрнасьці, і гэтым суцешыш Мяне ў горкім смутку, у які пагружае Мяне страта душаў.*

(Хвіліна цішы і роздуму)

К. Езу Найміласэрнейшы,

В. (Вернікі) асаблівасьцю Якога зьяўляецца літаваньне над намі і прабачэньне нам, + не зважай на грахі нашыя, але на давер, які ўскладаем на бясконцую дабрыню Тваю + і прымі ўсіх нас да дому Найлітасьцівага Сэрца Свайго + і не адпускай нас зь Яго навекі. + Просім Цябе праз любоў Тваю, + якая Цябе яднае з Айцом і Духам Сьвятым.

(Хвіліна цішы і роздуму)

К. Ойча Спрадвечны,

В. узглянь вокам міласэрнасьці асабліва на бедных грэшнікаў і на ўсё чалавецтва, + якое ўкрыта ў Найлітасьцівым Сэрцы Езуса + і дзеля Яго Балеснай Мукі акажы нам Сваю Міласэрнасьць, + каб мы ўсемагутнасьць Тваёй Міласэрнасьці праслаўлялі на вякі вечныя. + Амэн.

* Каронка да Божай Міласэрнасьці (чытаецца ці сьпяваецца)

Дзень другі

К. *Словы Пана Езуса да сястры Фаўстыны: сёньня прывядзі да Мяне душы сьвятароў, законьнікаў і законьніц і акуні іх у неспасьцігальную Міласэрнасьць Маю. Яны далі Мне сілу вытрываць горкую Муку; праз іх як праз каналы, сплывае на чалавецтва Мая Міласэрнасьць.*

(Хвіліна цішы і роздуму)

К. Езу Найміласэрнейшы,

В. ад Якога ўсё добрае зыходзіць, + памнож у іх ласку, + каб годна выконвалі ўчынкі міласэрнасьці, + каб тыя, што на іх глядзяць, праслаўлялі Айца Міласэрнасьці, Які ёсьць у небе.

(Хвіліна цішы і роздуму)

К. Ойча Спрадвечны,

В. узглянь вокам Міласэрнасьці Сваёй на грона абраных у вінаградніку Сваім, + на душы сьвятарскія і манаскія, + і адары іх моцаю Свайго благаславеньня, + і дзеля пачуцьцяў Сэрца Сына Свайго, у Якім душы гэтыя прабываюць, + удзялі ім моцы і сьвятла Свайго, + каб маглі яны весьці іншых на дарогах збаўленьня, + каб разам сьпявалі хвалу неспасьцігальнай Міласэрнасьці Тваёй на вякі вечныя. + Амэн.

* Каронка да Божай Міласэрнасьці (чытаецца ці сьпяваецца)

Дзень трэці

К. *Словы Пана Езуса да сястры Фаўстыны: сёньня прывядзі да Мяне ўсе душы пабожныя і верныя і акуні іх у моры Маёй Міласэрнасьці; гэтыя душы суцяшалі Мяне на Крыжовым Шляху, былі кропляю суцяшэньня сярод мора горычы.*

(Хвіліна цішы і роздуму)

К. Езу Найміласэрнейшы,

В. Які ўсім надзвычай шчодра ўдзяляеш Свае ласкі са скарбніцы Міласэрнасьці Сваёй, + прымі нас да Найлітасьцівага Сэрца Свайго + і не адпускай нас навекі. + Просім Цябе аб гэтым праз неспасьцігальную любоў Тваю, + якою палае Тваё Сэрца да Айца Нябеснага.

(Хвіліна цішы і роздуму)

К. Ойча Спрадвечны,

В. узглянь вокам Міласэрнасьці Сваёй на душы верныя як на спадчыну Сына Свайго + і дзеля Яго Балеснай Мукі + ўдзялі ім Свайго благаславеньня і атуляй іх Сваёю сталаю апекаю, + каб не страцілі любові і скарбу сьвятой веры, + але каб з усімі анёламі і сьвятымі + праслаўлялі бязьмерную Міласэрнасьць Тваю празь вякі вечныя. + Амэн.

* Каронка да Божай Міласэрнасьці (чытаецца ці сьпяваецца)

Дзень чацьвёрты

К. *Словы Пана Езуса да сястры Фаўстыны: сёньня прывядзі да Мяне паганаў і тых, што Мяне яшчэ не ведаюць. І пра іх Я думаў у Сваёй горкай Муцы, і будучая іх шчырасьць суцешыла Сэрца Маё. Акуні іх у моры Маёй Міласэрнасьці.*

(Хвіліна цішы і роздуму)

К. Езу Найлітасьцівы,

В. Які ёсьць сьвятло ўсяго сьвету, + прымі да дому Найлітасьцівага Сэрца Свайго душы паганаў, + якія Цябе яшчэ не ведаюць; + няхай промні ласкі Тваёй асьвецяць іх, + каб і яны разам з намі праслаўлялі незвычайную Міласэрнасьць Тваю + і не адпускай іх з дому Найлітасьцівага Сэрца Свайго.

(Хвіліна цішы і роздуму)

К. Ойча Спрадвечны,

В. узглянь вокам Міласэрнасьці Сваёй на душы паганаў + і тых, хто Цябе яшчэ не ведае, + і якія прабываюць у Найлітасьцівым Сэрцы Езуса. + Прыцягні іх да сьвятла Евангельля. + Гэтыя душы не ведаюць, якое вялікае шчасьце любіць Цябе. + Учыні, + каб і яны праслаўлялі шчодрасьць Міласэрнасьці Тваёй на вякі вечныя. + Амэн.

* Каронка да Божай Міласэрнасьці (чытаецца ці сьпяваецца)

Дзень пяты

К. *Словы Пана Езуса да сястры Фаўстыны: сёньня прывядзі да Мяне душы (братоў адлучаных) і акуні іх у моры Маёй Міласэрнасьці. У горкай Муцы разьдзіралі Мне цела і Сэрца, гэта ёсьць Касьцёл Мой. Калі вяртаюцца да еднасьці з Касьцёлам -- гояцца Раны Мае і такім чынам прыносяць палёгку Мне ў Муцы.*

(Хвіліна цішы і роздуму)

К. Езу Найміласэрнейшы,

В. Які зьяўляешся самою дабрынёю, +Ты не адмаўляеш сьвятла тым, хто просіць Цябе, + прымі да Найлітасьцівага Сэрца Свайго душы (братоў нашых адлучаных) + прыцягні іх Сваім сьвятлом да еднасьці з Касьцёлам + і не адпускай іх з дому Найлітасьцівага Сэрца Свайго, + але ўчыні, + каб і яны праслаўлялі шчодрасьць Міласэрнасьці Тваёй.

(Хвіліна цішы і роздуму)

К. Ойча Спрадвечны,

В. узглянь вокам Міласэрнасьці Сваёй на душы (братоў нашых адлучаных), + асабліва тых, + якія растрацілі даброты Твае і злоўжылі ласкамі Тваімі, + і якія ўпарта застаюцца ў сваіх грахах. + Не глядзі на іх памылкі, + але на любоў Сына Свайго і на горкую Муку Ягоную, якую прыняў дзеля іх, таму што і яны прабываюць ў Найлітасьцівым Сэрцы Езуса. + Учыні, няхай і яны праслаўляюць вялікую Міласэрнасьць Тваю на вякі вечныя. + Амэн.

* Каронка да Божай Міласэрнасьці (чытаецца ці сьпяваецца)

Дзень шосты

К. *Словы Пана Езуса да сястры Фаўстыны: сёньня прывядзі да Мяне душы ціхія і пакорныя і душы малых дзяцей і акуні іх ў Міласэрнасьці Маёй. Гэтыя душы найбольш падобныя да Майго Сэрца, яны давалі Мне сілы ў горкай Муцы кананьня. Я іх бачыў як зямных анёлаў, якія будуць чуваць ля Маіх алтароў.*

Іх адараю ўсімі ласкамі. Ласку Маю здольна прыняць толькі пакорная душа; пакорныя душы адараю Сваім даверам.
(Хвіліна цішы і роздуму)
К. Езу Найміласэрнейшы,
В. Які Сам сказаў: + "вучыцеся ад Мяне, бо Я ціхі і пакорнага сэрца...", + прымі да дому Найлітасьцівага Сэрца Свайго + ціхія і пакорныя душы і душы малых дзяцей. + Няхай гэтыя душы прыводзяць у захапленьне ўсё неба + і будуць асаблівым упадабаньнем Айца Нябеснага, + а таксама пахучым букетам перад тронам Божым, + ад водару якога Сам Бог мае асалоду. + Няхай гэтыя душы пастаянна будуць у Найлітасьцівым Сэрцы Тваім + і нястомна сьпяваюць гімн любові і міласэрнасьці навекі.
(Хвіліна цішы і роздуму)
К. Ойча Спрадвечны,
В. узглянь вокам Міласэрнасьці Сваёй на душы ціхія, пакорныя і на душы малых дзяцей, + якія прабываюць у доме Найлітасьцівага Сэрца Езуса. + Гэтыя душы найболей падобныя да Сына Твайго, + водар гэтых душаў узносіцца зь зямлі і дасягае трону Твайго. Ойча Міласэрнасьці і ўсялякае дабрыні, + прашу Цябе праз любоў і ўпадабаньне, якія маеш у гэтых душах, + благаславі ўсяму сьвету, + каб усе душы разам высьпеўвалі пашану Міласэрнасьці Тваёй праз вякі вечныя. + Амэн.
* Каронка да Божай Міласэрнасьці (чытаецца ці сьпяваецца)

Дзень сёмы

К. *Словы Пана Езуса да сястры Фаўстыны: сёньня прывядзі да Мяне душы, якія асабліва ўшаноўваюць і праслаўляюць Маю Міласэрнасьць і акуні іх у Маёй Міласэрнасьці. Гэтыя душы найболей смуткавалі над Маёю Мукаю і найглыбей праніклі ў дух Мой. Яны -- жывы адбітак Майго літасьцівага Сэрца. Гэтыя душы будуць ясьнець асаблівым сьвятлом у будучым жыцьці. Ніводная зь іх не трапіць у агонь пякельны. Кожную буду асабліва бараніць у часіну яе сьмерці.*
(Хвіліна цішы і роздуму)
К. Езу Найміласэрнейшы,
В. Сэрца Якога - сама любоў, + прымі да дому Найлітасьцівага Сэрца Свайго душы, + якія асабліва ўшаноўваюць і праслаўляюць веліч Міласэрнасьці Тваёй. + Душы гэтыя, магутныя сілаю Самога Бога, + сярод пакутаў і цяжкасьцяў няхай ідуць наперад, спадзеючыся на Міласэрнасьць Тваю. + Душы гэтыя паяднаныя з Табою, о Езу, + нясуць усё чалавецтва на плячах сваіх + няхай не будуць сурова асуджаныя, + але няхай Твая Міласэрнасьць атуляе іх у хвіліну сьмерці.
(Хвіліна цішы і роздуму)
К. Ойча Спрадвечны,
В. узглянь вокам Міласэрнасьці Сваёй на душы, + якія праслаўляюць і ўшаноўваюць найвялікую годнасьць Тваю, + г.зн. неспасьцігальную Тваю Міласэрнасьць, + якія прабываюць у Найлітасьцівым Сэрцы Езуса. + Няхай яны будуць жывым Евангельлем, +няхай рукі іхнія поўняцца ўчынкамі міласэрнасьці, + а сэрцы будуць перапоўнены радасьцю, + няхай сьпяваюць песьню міласэрнасьці Найвышэйшаму. + Прашу Цябе, Божа, + акажы ім Міласэрнасьць Сваю паводле надзеі і даверу, якія на Цябе ўскладалі. + Няхай споўніцца на іх абяцаньне Езуса, Які ім сказаў, + што душы, якія будуць ушаноўваць гэтую неспасьцігальную Міласэрнасьць Яго, + Сам Ён будзе бараніць у жыцьці, + а асабліва ў час сьмерці, як Сваю хвалу. + Амэн.
* Каронка да Божай Міласэрнасьці (чытаецца ці сьпяваецца)

Дзень восьмы

К. *Словы Пана Езуса да сястры Фаўстыны: сёньня прывядзі да Мяне душы, якія знаходзяцца ў няволі чыстцовай і акуні іх у бяздоньне Міласэрнасьці Маёй, няхай струмені Маёй Крыві ахалодзяць іх жар. Усе гэтыя душы вельмі любімыя Мною. Яны нясуць пакараньне перад Маёй Справядлівасьцю. У тваёй сіле прынесьці ім палёгку Бяры са скарбніцы Майго Касьцёла ўсе адпусты (індульгенцыі) і ахвяруй за іх... О, калі б ты ведала іх пакуту, то няспынна ахвяравала б за іх міласьціну духа і сплочвала б іх даўгі Маёй Справядлівасьці.*
(Хвіліна цішы і роздуму)
К. Езу Найміласэрнейшы,
В. Які Сам сказаў, што прагнеш міласэрнасьці, + вось жа прыводжу ў дом Твайго Найлітасьцівага Сэрца + душы чыстцовыя, + душы, вельмі мілыя Табе, + і якія, аднак, павінны адплочваць Тваёй Справядлівасьці. + Няхай струмені Крыві і Вады, якія выплылі з Твайго Сэрца, + згасяць полымя чыстцовага агню, каб і там славілася моц Міласэрнасьці Тваёй.
(Хвіліна цішы і роздуму)
К. Ойча Спрадвечны,
В. узглянь вокам Міласэрнасьці Сваёй на душы, якія пакутуюць у чыстцы, + і якія прабываюць ў Найлітасьцівым Сэрцы Езуса. + Прашу Цябе, дзеля Балеснай Мукі Езуса, Сына Твайго, + і праз горыч, якою была заліта Яго Найсьвятая Душа, + акажы Міласэрнасьць Сваю душам, + якія знаходзяцца пад справядлівым наглядам Тваім. + Не глядзі на іх інакш, + як толькі праз Раны Езуса, Сына Твайго Наймілейшага, + бо верым, што дабрыня і літасьць Твая бязьмерная. + Амэн.
* Каронка да Божай Міласэрнасьці (чытаецца ці сьпяваецца)

Дзень дзевяты

К. *Словы Пана Езуса да сястры Фаўстыны: сёньня прывядзі да Мяне душы абыякавыя, і акуні іх у бяздоньне Маёй Міласэрнасьці. Гэтыя душы найбалючэй раняць Сэрца Маё. Найбольшую агіду адчула душа Мая ў Агруйцы (Садзе Алійным) ад душ абыякавых. Яны былі прычынаю, што Я прамовіў: -- Ойча, аддалі ад Мяне гэты келіх, калі такая Воля Твая. Апошні паратунак для іх -- зьвярнуцца да Маёй Міласэрнасьці.*
(Хвіліна цішы і роздуму)
К. Езу Найлітасьцівы,
В. Які сама літасьць, + уводжу ў храм Найлітасьцівага Сэрца Твайго душы абыякавыя. + Няхай у гэтым полымі чыстае любові Твае + адаграюцца гэтыя зьледзянелыя душы, падобныя да мерцьвякоў, + якія такою агідаю перапоўнілі Цябе. + О Езу Найлітасьцівы, магутнасьцю Міласэрнасьці Сваёй + прыцягні іх да агню Сваёй любові + і адары іх сьвятою любоўю, бо Ты ўсё можаш.
(Хвіліна цішы і роздуму)
К. Ойча Спрадвечны,
В. узглянь вокам Міласэрнасьці Сваёй на душы абыякавыя, + якія прабываюць у Найлітасьцівым Сэрцы Езуса. + Ойча Міласэрнасьці, + прашу Цябе праз горкую Муку Сына Твайго + і праз трохгадзіннае кананьне Яго на крыжы, + дазволь, каб і яны праслаўлялі бяздоньне Міласэрнасьці Тваёй на вякі вечныя. + Амэн.
* Каронка да Божай Міласэрнасьці (чытаецца ці сьпяваецца).



Шчасьлівыя

У гэтай сям'і -- тры чалавекі: тата Ігар -- інжынер, мама Людміла -- праграміст і дачушка Марынка. Жывуць яны ў Наваполацку. Усе трое -- каталікі. Для кожнага зь іх Бог, вера, Касьцёл -- зусім не абстрактныя, а вельмі нават канкрэтныя паняцьці. Яны існуюць не адасоблена ад жыцьця, як гэта часта бывае, калі адзін і той жа чалавек у сям'і -- адзін, на працы -- другі, з сябрамі -- трэці, у касьцёле -- чацьвёрты. Гэтая маладая, прыгожая сям'я сумела спалучыць у сабе веру і жыцьцё. Менавіта таму "паталагічны гультай" Ігар (гэта ён так сябе называе), які зусім не супраць у суботу паляжаць з кнігай на канапе, альбо з таго ж самага мейсца паглядзець футбол, менавіта таму ён не займае канапу, а сядае на ранішні аўтобус і едзе...будаваць касьцёл у Полацку. І так -- праз усё лета. Што змушала яго на гэта? Сам Ігар напаўжартам, напаўсур'ёзна называе гэта Божым цудам.

А што прымушала іх траіх штодня прыходзіць на Маёвыя набажэнствы? Хадзілі па чарзе: адзін дзень Ігар быў на набажэнстве, а Люда ў гэты час гуляла з дачкой па парку, бо маленькая парафіянка Марынка пачасту любіла ўсчаць піск у душным памяшканьні. На другі дзень з каляскай прагульваўся Ігар, Люда ж была на набажэнстве. Ішоў час. Мінулася лета. І Марына перастала "ставіць канцэрты", бацькі ўздыхнулі з палёгкай -- у касьцёл можна хадзіць усёй сям'ёй.

Няраз даводзілася чуць сьлязьліва-ўмільныя словы з вуснаў якой-небудзь жанчыны: "Што за прыгожая сямейка! А як маіх дык не зацягнеш у касьцёл!.." Чаму іх "не зацягнеш" -- тэма асобнай гаворкі. І адказнасьць за гэта пачасту ляжыць на тых жа самых жанчынах, якія ў свой час не давялі сваіх дзяцей да першай споведзі, а то і не пахрысьцілі, якія слухмяна зьнялі абразы ў сваіх хатах, калі іхнія дзеткі загадалі ім гэта зрабіць. Аб усім гэтым жанчынам яшчэ думаць ды думаць. Бо ў Бога верацъ не тады, калі дазваляе ўлада, а тады, калі не верыць нельга.

Але сям'я Мурашкаў, пра якую ідзе размова, у гэтым выпадку зусім не прыклад традыцыйнай перадачы веры бацькоў сваім дзецям. Ігар прыняў хрост, калі яму было 25 гадоў. Прыняў сьвядома, ніхто яго не ўгаворваў на гэты крок, не пераконваў, якая "вера прыгажэйшая". Ды лепей за ўсё пра гэта распавядае сам Ігар:

-- Мне вельмі цяжка адказаць на гэтае пытаньне. Так, у сям'і мяне не вучылі маліцца, не далучалі да Касьцёла. Хаця мама -- з каталіцкай сям'і, і дух чагосьці такога неназванага ўсё адно быў. Я не магу сказаць, што я прыйшоў у Касьцёл таму, што спадзяюся штосьці атрымаць узамен. Гэта не гандаль. Напэўна, для кожнага чалавека раней альбо пазьней надыходзіць гэты час -- сустрэчы з Богам. І калі ён сапраўды надышоў, калі гэта выклікана не модай, тады, у прынцыпе, перад чалавекам і не стаіць гэткае пытаньне, ісьці ў касьцёл альбо не. Адназначна: ісьці. У Евангельлі сказана: "Не вы Мяне выбралі, але Я вас выбраў". Так што ў нас выбару няма. А калі ісьці, то чаму менавіта ў Касьцёл? Рэлігія -- не адносіны паміж людзьмі, але адносіны чалавека і Бога. Калі сказана, што: "Ты, Пётр, -- скала, і на гэтай скале Я збудую Касьцёл свой", то і трэба быць з пераемнікам Пятра. У нас ён ёсьць, і мы імкнемся ісьці за ім.

Людміла ж -- з праваслаўнай сям'і. Яе хрысьцілі ў дзяцінстве. У сям'і да рэлігіі асабліва не далучалі, але і ніколі не ўбівалі ў галаву, што Бога няма. Яна памятае, як бабуля хадзіла часам у Петрыкаўскую царкву, але ўнучкі з сабой не ўзяла ні разу. І ўнучка жыла сабе спакойна, не надта задумваючыся над вечнымі праблемамі. Але потым, калі нарадзілася Марына, зразумела, што дачку трэба абавязкова пахрысьціць. Ігар сказаў: трэба хрысьціць у касьцёле. Не пярэчыла. Некаторыя сваякі не зразумелі: "Няўжо ж ты хочаш стаць полькай?" Люда падзівілася, але як паслухмяная жонка зрабіла так, як хацеў муж. Наўрад ці думала сама тады, што гэткае магчыма ў яе жыцьці: нават не штонядзелю, а значна часьцей прымаць удзел у набажэнствах, удзельнічаць у парафіяльным жыцьці, блізка да сэрца прымаць усе праблемы мясцовага касьцёла.

А полькай яна сябе не адчула. Хутчэй -- яшчэ больш адчула сябе беларускай, бо ў касьцёле не толькі набажэнствы адпраўляюцца па-беларуску, але і ўвогуле, як лічыць Люда, гэта ці не адзінае месца ў горадзе, дзе так прыгожа і вольна, натуральна гучыць беларуская мова.

-- І ўсё ж, Люда, чаму менавіта Касьцёл? Ці толькі таму, што так захацеў муж? -- папытала я ў Людмілы.


-- Не, безумоўна, -- адказала яна, -- не толькі таму. Мяне вельмі ўразіла, што ў Полацку людзі зьбіраюцца на малітвы ў зусім непрыстасаваным для гэтага памяшканьні. Сьцюжа, пыл, бруд, а людзі кленчаць і славяць Бога... Пабачыўшы і перажыўшы такое, я не магла не прыйсьці зноў. А потым зразумела: гэта тое, чаго мне не хапае ў жыцьці. Я пачала больш задумвацца над тым, дзеля чаго я прыйшла ў гэты сьвет і які ён, гэты сьвет. Цяпер хочацца ісьці ў касьцёл, калі добра і ясна на душы, калі скрушна, штосьці баліць, трывожыць. Я пачала ўспрымаць сваё жыцьцё як Божы

дар, пачала вучыцца пакоры, зь якой трэба прымаць жыцьцёвыя выпрабаваньні. Гэта нялёгкая навука, але вельмі патрэбная. Дзякуючы ёй, я адчула, як зьмяніўся мой характар -- паспакайнеў, стаў больш лагодны.

Вера дапамагае ім жыць, успрымаць такі няпросты сьвет. Ігар, да прыкладу, лічыць, што ягонае сьветаўспрыманьне моцна зьмянілася: зьнікла пачуцьцё адзіноты, непатрэбнасьці гэтаму сьвету, сваёй бездапаможнасьці і пакутнасьці.

-- Не, я не адзін у гэтым сьвеце, -- сьцьвярджае ён. -- Заўсёды ёсьць Той, хто бачыць мяне, разумее, які можа прыняць альбо не прыняць мае ўчынкі, словы, думкі. Хтосьці заўсёды ёсьць побач, і Ён можа дапамагчы. Я гэта дакладна ведаю. А калі ў думкі прыходзіць штосьці нядобрае, то я пачасту таксама адчуваю Ягонае вока. Людзі кажуць: "я веру..." Але я ведаю: Бог ёсьць. Мае веды абапіраюцца на кнігі, пытаньні і адказы, нарэшце, на маё фізічнае адчуваньне Божай прысутнасьці.

Калі глядзіш на гэтых траіх, то міжволі ўзьбягае на думку: "Такое і ёсьць шчасьце..." Іхняе шчасьце яшчэ і ў тым, што яны прыйшлі да Бога ўсе разам, не пераадольваючы супраціўленьня адно аднаго, непрыняцьця, незразуменьня. Ім не давялося выбіраць паміж звычайным чалавечым шчасьцем і шчасьцем духоўным, паміж спакоем у сям'і і Касьцёлам. Яны не пакінулі адно аднаго дзеля Езуса Хрыстуса. Яны ідуць за Ім разам.



Мы ўжо неяк звыкліся ўспрымаць Касьцёл як наш боль, сум, плач. Многія з нас, прыйшоўшы ў Яго, прайшлі цераз боль і шматлікія перашкоды -- з боку грамадзтва, уласнай сям'і, блізкіх, а то і пераступаючы праз самога сябе. А сям'я Мурашкаў ідзе праз шчасьце, маладосьць, радасьць.

Гэта зусім не азначае, што ў іх няма праблем. Яны ведаюць усе праблемы сучасных маладых сем'яў, якія не могуць пахваліцца добрым заробкам, якія вымушаны шмат у чым адмаўляць сабе, якія жывуць у цеснай маласямейцы і г.д., і г.д. Проста, іхняе шчасьце больш высокае.

Ну а Марына? Самая маленькая наваполацкая парафіянка. Яна -- агульная любіміца ў касьцёле: і моладзі, і дзяцей, і старэйшых. Напэўна, не адзін прахожы зьдзіўлена падымае бровы, калі чуе, як яна вяшчае са сваёй каляскі па дарозе ў касьцёл альбо з касьцёла пра Езуса, касьцёл, ксяндза Францішка, сястру Магдалену... Ні тата, ні мама знарок яе гэтаму не вучаць. Проста, Марына падрастае ў касьцёле. Неяк яна запытала ў таты:

-- А чаму злыя людзі забілі Езуса?

Тата, уражаны пытаньнем, падумаў і адказаў:

-- Таму, што яны злыя.

Цяпер Марыне два з паловай гады. Пройдзе час -- і тату з мамай давядзецца адказаць сваёй дачушцы не на адно складанае пытаньне. І адказы гэтыя ім будзе знайсьці лягчэй, чым іншым. Бо ў іх ёсьць надзейны Дарадца, які не абмане, не падвядзе. Ягоныя наказы яны ўспрынялі сэрцам, яны для іх не механічнае выкананьне абавязковых абрадаў, не прыгожыя рытуалы, а шлях да Праўды. Надзвычай доўгі, складаны і ... шчасьлівы шлях. Бо шчасьлівыя тыя, якія даверылі сваё жыцьцё Богу.

І.СТУДЗЕНЬСКАЯ

Фота Эрнста ЦЕЦЯРОЎСКАГА



З НАШАЙ ПОШТЫ

Шаноўная рэдакцыя!

Газета "Ave Maria" дайшла да Друі, Ідолты, а, магчыма, і да Росіцы. Ад свайго ўласнага імя і нашых вернікаў прагну сардэчна падзякаваць за цудоўны дар. Дзякуем таксама за артыкул аб Законе Марыянаў, за памяць аб нашых мучаніках з Росіцы, за інтэрв'ю з сястрой Ядвігай Віршута на тэму росіцкай трагедыі. Праводзячы рэкалекцыі, прасілі, каб зьбіраліся ў дамах і чыталі газету -- як далейшае прадаўжэньне рэкалекцый у дамашнім касьцёле.

З аказіі надыходзячых Велікодных сьвятаў жадаю рэдакцыйнай радзе, каб пад апекай Маці Божай Фацімскай справа, распачатая вамі, плённа служыла Касьцёлу на Беларусі.

Ксёндз Антоні Лось



Laudetur Jezus Christus!

Дарагая рэдакцыя газеты "Ave Maria".

Прачытаў 1-2 нумар вашай газеты, і ён мне вельмі спадабаўся. Я знайшоў там шмат цікавага для сябе. Вельмі добра, што маеце ў газеце паэтычную старонку. Прапаную для яе свае вершы. Сам я нарадзіўся і вырас у рэлігійнай каталіцкай сям'і ў горадзе Гомелі. Даўно марыў, каб такая, як ваша газета, была даступная людзям на Беларусі і разыходзілася па касьцёлах, паглыбляла рэлігійную сьвядомасьць у вернікаў, дапамагала людзям пазнаваць навіны Касьцёла на Беларусі і ў сьвеце. Буду мець у маіх малітвах усіх супрацоўнікаў газеты "Ave Maria".

Павел Халяўкін
клерык V курсу гарадзенскай духоўнай семінарыі

Павал ХАЛЯЎКІН

Апостал года Тадэвуш лічыцца дапаможцам у справах цяжкіх і безнадзейных.

Хвалу табе, Юда Тадэвуш,
З усёй пасьвячаю душы.
Дай Божае ласкі, не гневу
Жыцьцём мне сваім заслужыць.

Малюся й прашу дапамогі,
Бо крыж мой даволі цяжкі.
Дай моцы не збочыць з дарогі,
І з годнасьцю шлях свой прайсьці.

Малюся і чую, што сілы
Маёй дадаецца душы.
Дык дзякуй, апостале мілы, --
Натхнёна шапчу я ў цішы.


БУДУЕЦЦА КАСЬЦЁЛ

ПАН БОГ ДАПАМАГАЕ РУПЛІВЫМ

Быў час, калі гарадзкую панараму старажытнага Полацка ўпрыгожвалі 6 мураваных і 4 драўляныя касьцёлы. Разам з праваслаўнымі цэрквамі, адбудаванай уніяцкай Сафіяй, пратэстанцкай кірхай яны стваралі непаўторны архітэктурны краявід хрысьціянскага горада. Але пасьля далучэньня Беларусі да Расіі, у мінулым стагоддзі пачаўся разбуральны наступ на каталіцкія сьвятыні: былі скасаваныя бэрнардынскі і францішканскі кляштары, зачынены езуіцкі калегіум, ліцэй айцоў піяраў...

У дваццатым стагоддзі гэты наступ прадоўжыўся і цяпер палачане маюць сумны вынік гвалтоўнага разбурэньня сьвятыняў. Сёньня Полацк не мае ніводнага касьцёла. Але гэта зусім не азначае, што ў аднячас з разбурэньнем камяніцаў разбураецца і вера людзей. І лепшы таму доказ -- зноў жа Полацк. У розныя бакі пралягалі шляхі, па якіх полацкія каталікі езьдзілі ў Касьцёл -- у Глыбокае, Празарокі, Міёры, Браслаў, нават у суседнія Латвію альбо Літву. Езьдзілі, каб атрымаць неабходныя сакраманты, памаліцца ды сьветла пазайздросьціць тым, чые храмы не разбурыла віхура часу. Богу яны давяралі свае крыўды, свой боль, свае надзеі. І Ён пачуў іх, пачуў і натхніў на ажыўленьне веры, вяртаньне да жыцьця парафіі ў самім Полацку. І вось ужо пяты год полацкія католікі не езьдзяць болей за сотні кіламетраў у касьцёл, а моляцца ў сваім родным горадзе. Напачатку -- пад адкрытым небам, затым знайшлі сякітакі прытулак. А потым дзяржава, нібы засаромеўшыся свайго гвалту над верай, аддала вернікам будынак старога кінатэатра.

Будынак няўтульны, амаль што ў аварыйным стане. Але вернікі падзякавалі Пану Богу за гэты дар і ўзяліся за працу. Большасьць з тых, хто з кіркамі ды ламамі пачалі разьбіваць старую кладку, каб затым умацаваць і аднавіць яе, былі пенсіянеры. Маладзейшыя маглі дапамагчы ім хіба толькі ў суботу, у выхадны дзень. Так і выйшла, што спякотным летам 1994 году ўжо немаладыя мужчыны і жанчыны пачалі будаваць касьцёл у Полацку. Цяпер гэта ўзгадваецца як нешта цалкам неверагоднае. Спаленыя на сонцы твары, рукі, крывавыя мазалі на далонях, у часе адпачынкаў -- падмацаваньне не толькі ежай, але й лекамі, пасьля працоўнага дня -- малітвы ў касьцёле, які будуецца, Імша Сьвятая. А ўначы -- вартаваньне па чарзе распачатай будоўлі. Бо ні для каго не сакрэт, што ласых на тое, што дрэнна ляжыць, у нас яшчэ ой як хапае.



Старыя сьцены трэба ўмацаваць. І не толькі цэглай ды растворам, але й потам, замешаным на веры, надзеі, любові

Земляныя работы не для жанчын, але што зробіш, што зробіш



-- Толькі тады гэты касьцёл будзе нашым, толькі тады ён узьнясе свае крыжы да неба, калі мы з вамі пальём сваім потам кожную ягоную цагліну, -- няраз прамаўляў у сваіх казаньнях ксёндз-дзекан Францішак Кісель.

Палівалі. Чаго-чаго, а поту хапіла. На кожны камень, кожную цагліну, кожны камяк застарэлага раствору, які трэба акуратна адбіць ад цэглы, каб не пашкодзіць яе, каб яна яшчэ паслужыла...

Жыхары бліжэйшых ад касьцёла дамоў



зь недаверам, а то і з кпінамі сачылі за "фанатыкамі": каб дзесятак састарэлых ды пару маладзейшых людзей храм пабудавалі -- такога яшчэ не чувалася!.. Безумоўна. Але кожны вернік ведае, што для Пана Бога няма немагчымага, і што Ён дапамагае тым, хто й сам рупіцца.



Група польскіх будаўнікоў разам з ксяндзом Францішкам Кіселем пасьля чарговага працоўнага дня ў будучым касьцёле

Гэтак і здарылася. Аднаго яснага суботняга дня да будоўлі пад'ехаў аўтобус, зь якога выйшлі 19 мужчын з будаўнічым інструментам. Прапанавалі свае паслугі. Бясплатна. За дзякуй. Без прэтэнзій на ўзнагароду. І прыйшло тое дзіва-дзіўнае з фірмы "Рэго" (г.Красьнік, што ў Польшчы). Кіруе фірмай пан Ян Чэлей. Мінулым летам фірма абсталёўвала ў Наваполацку гатэль. Паглядзеўшы на мучэньні мясцовых вернікаў, палякі вырашылі дапамагчы сваім братам па веры. Будоўляй у Наваполацку кіруе пан Тадэвуш Змарчыньскі. Зь ягонай згоды, а можа, і зь ініцыятывы будаўнікі ахвяраваліся кожную суботу, у свой законны выхадны прысылаць некалькі спецыялістаў на будоўлю касьцёла. У першы ж дзень было зроблена столькі, колькі нашы самаахвярныя энтузіясты не зрабілі б і за месяц. Увечары таго дня стомлены працай і ўражаньнямі, шчасьлівы айцец Францішак казаў сваім парафіянам: "Ніколі не забуду гэты дзень". Праз тыдзень гісторыя паўтарылася. І справа зрушылася з месца.

У нядзелю дабрадзеяў з Красьніка можна было спаткаць на набажэнстве. Апошняя акалічнасьць нямала дзівіла многіх мясцовых мужчын, звыклых бавіць свой вольны час усё больш за чаркай, на рыбалцы, на прыродзе. Бо як тут зразумець, якаятакая сіла змушае іншаземца, якому аніколькі, здавалася б, не павінен абыходзіць ні гэты горад, ні гараджане, ні іхнія праблемы, ісьці і працаваць на будове храма, якога, можа, ніколі потым іншаземец не пабачыць. Ды ёсьць яна, тая невядомая сіла, якая руйнуе паняцьце межаў, палітыкі, эканомікі. Гэтая сіла -- вера.

Менавіта яна змусіла і жыхароў далёкага нямецкага горада Фрыдрыхсхафена прыняць самы непасрэдны ўдзел у будове будучага касьцёла сьв.Андрэя Баболі (відаць, ёсьць у гэтым вялікі сэнс -- каб касьцёл у Полацку, які вытрываў выпрабаваньні злой сілы, насіў імя менавіта гэтага мужнага і адважнага сьвятога зямлі нашай). Каталікі парафіі касьцёла сьвятога Пятра Канізіуса з Фрыдрыхсхафена, даведаўшыся, што ў Полацку будуецца касьцёл, вырашылі таксама дапамагчы. Гэтая дапамога мае самыя розныя праявы: ад пасылак з адзеньнем і алівай да значнай грашовай дапамогі. Дарэчы, гэтая парафія дапамагае і сваім аднаверцам з далёкага й бядотнага Сараева, чыя вера правяраецца цяпер агнём ды мячом. А пан Карл Фрэнкель за свае ўласныя грошы адліў і прыслаў 800-кілаграмовы звон для будучага Полацкага касьцёла. Сьценаў яшчэ няма, званніцы няма, а звон ужо ёсьць. І людзі ведаюць: прыйдзе час, калі ён сваім звонам пакліча палачан на Сьвятую Імшу.

На гэтым месцы будзе некалі галоўны алтар




А пакуль... Пакуль штодзённыя набажэнствы адбываюцца ў двух цесных пакойчыках. Тут вернікі дзякуюць Пану Богу за магчымасьць складаць Яму штодзённую бяскроўную ахвяру. За ласку веры і надзеі, без чаго папросту не было б усёй гэтай гісторыі. Гісторыі касьцёла ў Полацку, якая пачалася ў XII стагодзьдзі і доўжыцца да нашых дзён, каб знайсьці працяг у будучых пакаленьнях. А яшчэ вернікі дзякуюць Богу за тое, што зь Ягонае ласкі на зямлі ёсьць шмат добрых, спагадных людзей, гатовых прыйсьці з дапамогай да свайго бліжняга, дзе б ён ні жыў: у суседнім доме, альбо за тысячы кіламетраў. Няхай жа добры Бог апякуецца ўсімі, хто не здраджвае Яму.

Ірына ЖАРНАСЕК
Фота Віктара СЕДЗЮКЕВІЧА

Дарагія дзеці!

Людзі, якія не хацелі, каб Пан Езус хадзіў па Зямлі і навучаў, аднаго разу зьвязалі Яго і адвялі на суд да Пілата.

Пан Езус быў сур'ёзны, задумлівы і ціхі, а людзі голасна крычалі: "Укрыжуй Яго!.." Судзьдзя Пілат згадзіўся. У той час людзі кпілі з Пана Езуса; білі Яго і загадалі яму несьці цяжкі крыж на Кальварыю. Пан Езус нёс крыж, падаў пад яго цяжарам. Калі



Ён дайшоў да гары Кальварыі, злыя людзі прыбілі Яго да крыжа. Пан Езус вісеў на крыжы і маліўся да Бога, маліўся за людзей, асабліва за тых, якія прычынілі Яму такую вялікую крыўду. Пад крыжам Пана Езуса стаяла Яго Маці Марыя. Калі Пан Езус памёр на крыжы, адразу зрабілася цёмна, і страсянулася зямля. Людзі баяліся. Пазьней прышлі прыяцелі Пана Езуса і зьнялі Яго цела з крыжа і паклалі Яго ў гроб у скале.

У кожным касьцёле ў часе Вялікага тыдня людзі робяць гроб, які нагадвае нам гроб Пана Езуса. Кладуць фігуру памерлага Збавіцеля, а ў Вялікую Пятніцу ксёндз заносіць туды Пана Езуса ў прыгожай дараносіцы. Пан Езус у гэты час прысутнічае

"Ave Maria" — дзеткам

сярод нас у постаці хлеба. Людзі прыносяць кветкі, таму што любяць Пана Езуса. Бо каго любяць, таму прыносяць кветкі. Людзі складаюць гэтыя кветкі каля гроба Пана Езуса.

Ці застаўся Пан Езус назаўсёды ў гэтым гробе? Не. Вельмі нядоўга гэты гроб быў смутны, таму што на трэці дзень зь яго падняўся жывы Пан Езус. Пан Езус -- Бог і Ён усё можа. Таму й Зьмёртвыхпаўстаў. Пасьля Зьмёртвыхпаўстаньня Пан Езус быў прыгожы і моцны. Салдаты, якія вартавалі гроб Пана Езуса, калі ўбачылі сьвятло, перапалохаліся і ўцяклі.

Да гробу Пана Езуса прыйшлі тры набожныя жанчыны. Не знайшлі цела Пана Езуса, але ўбачылі анёла. Анёл ім сказаў: "Не шукайце Пана Езуса ў гробе, таму што Ён Зьмёртвыхпаўстаў. Ідзіце і скажыце аб гэтым вучням Езуса, Яго апосталам". Жанчыны пайшлі і расказалі ўсё, што бачылі і што ім сказаў анёл.

На прыпамін Зьмёртвыхпаўстаньня Пана Езуса мы адзначаем Вялікодныя Сьвяты ў касьцёле і дома. У Вялікодную Нядзелю ўсе разам зранку ідзем да касьцёла. У касьцёле ксёндз падыходзіць да пустога гробу і сьпявае: "Альлелюя". Потым бярэ ў рукі залатую дараносіцу, у якой пад постацьцю белага аплатка прабывае жывы Пан Езус -- і пачынае сьпяваць Вялікодную песьню. Усе людзі ў касьцёле падхопліваюць гэтую песьню. Выходзяць з касьцёла і абыходзяць яго адзін ці тры разы з працэсіяй. Людзі радасныя і пад гукі званоў сьпяваюць песьні Зьмёртвыхпаўсталаму Пану Езусу.

Вялікодныя Сьвяты мы адзначаем і дома. У гэтыя дні будзьце радасныя, ветлівыя, выхаваныя... Паслухайце: хто любіць, той іншым прыносіць радасьць. Пастарайцеся быць такім сонейкам у сябе дома на Вялікдзень.

Кс.Ян ТВАРДОЎСКІ

КСЯНДЗЫ І СЛАНЕЧНІК

Ёсьць розныя ксяндзы. Бываюць такія высокія, як жардзіны, што ім зусім не трэба станавіцца на крэсла, каб запаліць сьвечку на самай вяршыні каляднай ёлкі. Часам бываюць гэткія малыя, што на амбоне падымаюцца на дыбачкі -- каб іх бачылі парафіяне.

Часам ёсьць слабыя, глытаюць парашкі і зёлкі. А часам гэткія дужыя, што змогуць схапіць за рогі быка, калі б той сарваўся з ланцуга.

Часам -- худыя і тонкія, часам -- тоўстыя.

Бачыў неяк гэткага таўсматага ксяндза: увайшоў у спавядальніцу, усеўся, але потым не мог выйсьці. Уціснуўся, бедачына, усярэдзіну, але потым нізавошта не мог выцерабіцца з канфесіяналу. Дык падняўся разам зь ім і пайшоў па касьцёле, як чарапаха, якая нясе на сабе цьвёрды і цяжкі панцыр.

Часам ксяндзы сьпяваюць так прыгожа, што бабулі, каб толькі можна было, білі б «брава». Часам пішчаць альбо рыкаюць так, што мышы ўцякаюць.

Часам прамаўляюць прыгожыя казаньні, а часам нібы заікаюцца.

Аднак усе ксяндзы -- і высокага росту, і малога, і шчуплыя, і тоўстыя -- палюбілі Пана Езуса. Яны пастаянна гавораць пра Езуса -- у часе казаньняў і апроч іх, на шлюбе і на пахаваньні, калі цурболіць дождж, і калі падае сьнег.


Напэўна, дзеці, вы бачылі сланечнік.


Сланечнік заўсёды паварочваецца сваім жоўтым круглым капялюшам да сонца. Як сланечнік паказвае, зь якога боку сьвеціць сонца, так і ксёндз хоча паказаць нам Пана Езуса.

Калісьці хлопцам бачыў, як ксёндз плакаў.

Кленчыў у пустым касьцёле і плакаў.

Я баяўся падысьці да яго, бо ён плакаў перад Панам Езусам.









Малюнкі Аляксандра ЖАРНАСЕКА (14 год)

З часу выданьня першага нумара нашай газеты прайшло амаль чатыры месяцы. За гэты перыяд мы атрымалі шмат лістоў ад сваіх чытачоў. Асабліва нас радуюць юныя карэспандэнты, якія не толькі дасылаюць нам правільныя адказы на крыжаванкі і дзякуюць за газету, але і вельмі цікава расказваюць аб сваім парафіяльным жыцьці. Таму сёньня мы з радасьцю зьмяшчаем некаторыя зь іх лістоў.

Добры дзень!

Паважаная рэдакцыя газеты "Ave Maria", вельмі нам спадабалася ваша газета. Шмат цікавага мы даведаліся пра жыцьцё Пана Езуса, пра Маці Божую і Сьвятых. Але нам вельмі хочацца расказаць пра наш касьцёл і нашага ксяндза. Мы парафіянкі Быстрыцкай парафіі. Нашаму касьцёлу больш за 500 гадоў. Стаіць касьцёл на беразе прыгожай ракі Вілія. Апошнія пяць гадоў вялікія зьмены адбыліся ў нашым касьцёле. Свайго ксяндза ў нашай парафіі няма. Да нас прыязджае з Варнянскага касьцёла ксёндз Зьдзіслаў Пікула. Мы хадзілі ў 3 клас, калі ксёндз прыехаў да нас, а цяпер ходзім у 8-ы клас. Усе гэтыя пяць гадоў ксёндз Зьдзіслаў кожную нядзелю і сьвяты разам з намі. Вучыць любіць Бога, Маці Божую і ўсіх сьвятых, шанаваць бацькоў і ўсіх людзей, жыць па-божаму. А як зьмяніліся нашы вёскі! У кожнай вёсцы адноўленыя крыжы, і ў маі месяцы мы зьбіраемся цэлай вёскай на малітвы да Маці Божай Маёвай. А як цудоўна праходзіць сьвята Першай Камуніі Сьвятой, фэсты на Сьвятога Яна і Падвышэньня Крыжа. На сьвята Сьв.Яна з працэсіяй ходзім да цудадзейнай крыніцы Сьв.Яна, там кс.Зьдзіслаў паставіў капліцу. А як прыемна, калі ксёндз з калядою прыходзіць да нашых дамоў, здаецца яшчэ і яшчэ раз чакалі б. А якое шчасьце з ксяндзом гуляць у футбол, разам ехаць на возера Нарач на веласіпедах (50км) на адпачынак, там кожнае лета мы па тыдню бываем, жывём у палатках, раніцай і вечарам адпраўляецца Сьвятая Імша.

Кс.Зьдзіслаў вельмі заняты чалавек. У сваёй Варнянскай парафіі адрамантаваў касьцёл, які 42 гады быў зачынены і вельмі запушчаны, потым з касьцёла быў зроблены клуб... Сапраўднага гаспадара прыслаў Пан Бог нашым парафіянам. Шчыра дзякуем ксяндзу Зьдзіславу за ўсё дабро, якое ён рабіць для нас. Наша дзяцінства сапраўды шчасьлівае, і гэта менавіта дзякуючы нашаму каплану. Мы маем права хадзіць да касьцёла, вучыць малітвы, сьпяваць сьвятыя песьні і разам з намі заўсёды наш ксёндз. Шчыра дзякуем кс.Зьдзіславу за цяжкую працу, за цярпеньне, за яго добрае сэрца. Жадаем яму здароўя, шчасьця і посьпехаў у працы, а таксама і яго родным.

Парафіянкі Быстрыцкай парафіі,
сёстры ***Галіна і Ірына Яновіч.***

Пахвалёны Езус Хрыстус!

Піша Вам міністрант з касьцёла Сьвятой Тройцы, што знаходзіцца ў горадзе Глыбокім. Мне вельмі падабаецца газета "Ave Maria", асабліва крыжаванкі. Мама пачала вадзіць мяне на ўрокі рэлігіі, якія праводзіць сястра Эльжбета, з чатырох гадоў. Цяпер я вучуся ў 3 класе. Дзякуючы сястры Эльжбеце і ксяндзу-дзекану Цырылю, мы перажылі самыя радасныя хвіліны нашага дзяцінства. Гэта першая Сьвятая Камунія, белая нядзеля, гадавіна першай споведзі. На сьвята Божага Нараджэньня мы кожны год ставім пастаноўкі, але кожны год розныя, ніколі няма паўтарэньня. Цікава праходзяць у нашым касьцёле маёвыя набажэнствы, ружанцовыя, а цяпер дарога Крыжовая. Вельмі многа прыходзіць дзяцей і мы молімся і просім Бога даць нам ласку моцнай веры, дзякуем за любоў Бога да нас. Ён не пашкадаваў нават свайго жыцьця, каб вызваліць нас з грахоў.

Дзякую Вам за газету і крыжаванкі.

Андрэй Яцына

Паважаны ксёндз Мацей!

У газеце "Ave Maria" у нумарах 1-2 (3-4) 1995 года надрукавана крыжаванка. Трэбы было адказаць на трынаццаць пытаньняў і даведацца пра вельмі важныя словы. Я іх адгадала: "Бог любіць цябе!" Гэта сапраўды вельмі важныя словы.

Гэта газета трапіла да мяне з рук ксяндза Зыгмунта Абартуха. Я і не спадзявалася, што газета зьмяшчае столькі цікавых матэрыялаў, што з гэтых матэрыялаў можна столькі даведацца пра нашу веру.

Я жыву ў в.Сьцешыцы Вілейскага раёна. У ёй будуецца касьцёл Перамяненьня Панскага. Ён яшчэ не дабудаваны, і ксёндз праводзіць Сьвятую Імшу ў клубе, у актавай зале. Я заўсёды чытаю на Імшы біблійныя тэксты. А вучуся я ў шостым класе.

Наташа

Добры дзень!

Шаноўны Ойча Мацей!

Піша да Вас вучань сёмага класа горада Глыбокае. Вучуся я добра. Кожную нядзелю хаджу ў касьцёл і ўдзельнічаю ў Сьвятой Імшы. У касьцёле паслугую ксяндзу-дзекану (міністрантам). Яшчэ я наведваю лекцыі па рэлігіі і хаджу ў музыкальную школу, вучуся іграць на гітары.

Высылаю Вам адказы на крыжаванку. Калі я адказаў на ўсе пытаньні, у вертыкальным выдзеленым слупку, прачытаў сапраўды вельмі важныя словы: "Бог любіць цябе". Бог сапраўды любіць нас, але не ўсе людзі гэта разумеюць. Вось за такіх людзей нам трэба маліцца.

Я вельмі хачу быць падобным да Пана Езуса, але ў мяне не заўсёды так атрымліваецца.

У мяне ёсьць тата і мама. Яны вераць у Бога і таксама ходзяць у касьцёл...

Да пабачэньня, шаноўны Ойча Мацей, застаньцеся з Панам Богам.

Барыла Віталі



Дарагія дзеці!

Вельмі прыемна, што наша газета трапляе ў вашы рукі і вам падабаецца. Я атрымаў больш за 120 лістоў ад вас, у якіх вы даяце правільныя адказы на крыжаванку ў № 1-2. Вельмі цікава чытаць лісты, у якіх вы пішаце пра сябе, пра сваю сям'ю, дзеліцеся сваімі праблемамі. Я пастараюся напісаць вам яшчэ і ў гэтым месяцы, маю надзею, што мы з вамі пасябруем.

Асаблівы дзякуй хочацца сказаць Сьвятлане з в.Раднікі, якая сама склала крыжаванку. Думаю, што мы можам разам прыдумваць нашу дзіцячую старонку.

А цяпер – першы конкурс: складзіце крыжаванку і прышліце мне. Самую цікавую мы зьмесьцім у нашай газеце праз два месяцы і, зразумела, вас чакаюць узнагароды.

Зь нецярпеньнем чакаю вашых лістоў.

а.Мацей

КРЫЖАВАНКА

1. Чым была закрыта грабніца Пана Езуса?
2. Каго ўбачылі жанчыны ў грабніцы Пана Езуса пасьля Яго ўваскрашэньня?
3. Куды ўзьнёсься Езус пасьля Зьмёртвыхпаўстаньня?
4. Размова з Богам.
5. Як звалі вучня Езуса, які Яго выдаў?
6. Імя любімага вучня Езуса.
7. Як называецца нядзеля перад Вялікаднем?
8. Імя чалавека, які зьняў цела Езуса з крыжа.
9. Назва вёскі, куды ішлі два вучні, да якіх далучыўся ўваскрослы Пан Езус.
10. Колькі Сьвятых Сакрамантаў?
11. Хто першы ўбачыў уваскрослага Пана Езуса?
12. Першы зь сямі Сьвятых Сакрамантаў.
13. З прабітага дзідаю боку Пана Езуса сплыла Кроў і ...
14. Імя апостала, якога прынялі замест Юды.

Правільныя адказы дасылайце на адрас: 222690, Мінская вобл., Стаўбцоўскі р-н, в.Н.Свержань, вул.Нясвіжская, 21, а.Мацею. Вельмі просім не дасылаць вырваныя старонкі з газеты, а толькі адказы на пытаньні.

Правільны адказ на крыжаванку, зьмешчаную ў № 1-2: ***"Бог любіць цябе".***

Узнагароды атрымаюць:




Сьвятлана -- в.Раднікі
Наташа -- Сцешыцы
Ірына -- Вігушкі.
Андрэй -- Н.Свержань
Таня -- Івянец
Сьвятлана -- Петкавічы

Аня -- Мінск
Павел -- Лагойск
Юрась -- Дзяржынск
Ірына -- Любань
Дзіма -- Савані
Ірына -- Слуцк



Узнагароды высланы поштаю, просім нам напісаць, ці атрымалі іх.



Хрыстус Зьмёртвыхпаўстаў у ноч з суботы на нядзелю. Увечары пачынаюцца рытуалы вігіліі зьмёртвыхпаўстаньня -- Вігіліі Пасхальнай. Спачатку асьвячаецца агонь і запальваецца пасхал -- велікодная сьвечка, якая нагадвае Зьмёртвыхпаўсталага Езуса. Пасьля чытаюцца тэксты аб гісторыі збавеньня. Потым асьвячаецца вада і аднаўляецца абяцаньне хросту. У даўнія часы менавіта ў Вялікую Суботу людзі, якія жадалі належаць да Касьцёла, прымалі хрост. Пасьля пачынаецца Сьвятая Імша. Яна павінна быць пасьля поўначы, ужо ў нядзелю, бо ў гэты час Езус Зьмёртвыхпаўстаў. Але найчасьцей Сьвятая Імша пачынаецца ў суботу вечарам. Гэтая Імша заканчваецца рэзурэкцыйнай працэсіяй, у якой мы нясём фігуру Зьмёртвыхпаўсталага Пана.

Дарагія нашы чытачы!

Вось і прычакалі мы з вамі сьветлага Хрыстовага Уваскрашэньня. Вясна прыйшла ў нашыя сэрцы разам з прамянямі вялікае збаўчае Любові Хрыстуса. Дык няхай жа пад гэтым жыцьцядайным цяплом расквецяцца нашыя душы радасьцю і спагадаю. Няхай ніколі не пакідае іх глыбокая вера і надзея.

Вясёлага вам Алелюя і смачнага вялікоднага яйка!

Рэдакцыя газеты "Ave Maria"

"Ave Maria" красавік 1995 № 4 (6)
Заснавальнік – Дабрачынны фонд "Маці Божая Фацімская"
Газета зарэгістравана ў Міністэрстве Інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйны № 952
Рэдакцыйная рада:
а.Мацей MSF, Ірына Жарнасек, Аліна Лукашэвіч, Крыстына Часноўская, Таццяна Царук
Камп'ютэрная вёрстка і дызайн – Эльвіра Ваўчок
Надрукавана ў друкарні афсетным друкам на Мінскай паліграфічнай фабрыцы "Чырвоная зорка", МППО імя Я.Коласа (220079, г.Мінск, 1-ы Загарадны зав., 3) зак.2255 Тыраж 6000 экз.
Адрас рэдакцыі: 220030, г.Мінск, пл.Свабоды, 9, п.10
Газета выдаецца на ахвяраваньні вернікаў